Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

16 СТУДЗЕНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 7 (27617) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Месяцовы пасяўны каляндар

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

Стасункі з марсіянамі — па-беларуску!

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.01.2014 г.

Долар ЗША	9560,00	▲
Еўра	13040,00	■
Рас. руб.	286,50	▼
Укр. грыўня	1148,07	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 3°
Віцебск	– 6°
Гомель	– 3°
Гродна	– 6°
Магілёў	– 7°
Мінск	– 7°

ЛІЧБА ДНЯ

5 млн кв. м жылля

плануецца пабудаваць сёлета ў краіне. Такое заданне зацверджана пастановай Савета Міністраў № 1191. З дзяржаўнай падтрымкай для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, сёлета будзе пабудавана 2,5 млн кв. м жылля. У сельскіх населеных пунктах і малых гарадскіх паселішчах запланавана ўзвесці 1,5 млн кв. м. Зацверджаны таксама заданні для кожнай вобласці і Мінска. Так, у Мінскай вобласці будзе пабудавана 1,1 млн кв. м, Брэсцкай — 770 тыс., Гомельскай — 650 тыс., Гродзенскай — 660 тыс., Віцебскай — 410 тыс., Магілёўскай — 410 тыс. У Мінску намечана ўзвесці 1 млн кв. м жылля.

ISSN 1990 - 763X

ЖЫЦЦЁВАЯ НАВУКА

Фота БЕЛТА.

Гэта будзе першы ў Беларусі дзіцячы гарадок сямейнага тыпу, дзе хлопчыкі і дзяўчынкі змогуць жыць у асобных кватэрах. Пілотны праект рэалізуецца з кастрычніка мінулага года ў Мазырскім дзіцячым доме, у якім пражывае больш за 60 дзяцей. 17 з іх — паліятыўныя інваліды. Тут будзе ўведзена ў строй пяць асобных кватэр. Рэалізацыя гэтага праекта дазволіць выхаванцам вучыцца жыць самастойна, распараджацца грашыма і быць адказнымі за сваё жыццё.

ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў агучыў ключавыя прыярытэты работы эканомікі ў 2014 годзе, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Так, галоўнымі задачамі на гэты год з'яўляюцца збалансаваны эканамічны рост і эфектыўнасць. Не менш актуальнымі застаюцца таксама пытанні, якія датычацца экспарту і аптымізацыі імпарту. «Мы павінны значна нарасціць аб'ёмы экспарту і ў пэўнай ступені рацыяналізаваць імпарт, для таго каб забяспечыць дадатнае сальда», — паставіў задачу Міхаіл Мясніковіч. У сувязі з гэтым урад разлічвае на актыўную работу камерцыйных банкаў, а таксама Нацыянальнага банка як галоўнага рэгулятара грашова-крэдытнай палітыкі.

Адносна ўстаноўленых паказчыкаў прэм'ер адзначыў, што перш за ўсё неабходна ўводзіць дыктат паказчыкаў эканамічнай эфектыўнасці, а не вала. Ацэнка ж работы прадпрыемстваў павінна давацца, у першую чаргу, па прыбытку, забяспечанасці абаротнымі сродкамі і росту прадукцыйнасці працы.

«Трэба смела і актыўна ісці на рэструктурызацыю стратных і неплацежаздольных арганізацый», — адзначыў прэм'ер. Аб гэтым, паводле яго слоў, гаворыцца шмат, але да гэтага часу практычна нічога не зроблена. «Неэфектыўныя прадпрыемствы і вытворчасці не павінны жыць за кошт бясконцых бюджэтных датацый і добра працуючых калег», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Перад усімі арганізацыямі ставіцца задача на працягу першага квартала з улікам развіцця новых сектараў і галін эканомікі правесці аптымізацыю.

СТАР. 2

■ Сітуацыя

Вуліца-прывід

Такую можна сустрэць не толькі ў чарнобыльскай зоне, а і ў сталіцы

Прыкладна месяц таму выпадкова стаў сведкам размовы двух старых, якія гутарылі каля помніка піянеру-герою Марату Казею ў сталічным парку імя Купалы. Увагу прыцягнула адна рэпліка: «Ведаеш, а ў Мінску ж ёсць і вуліца, названая ў гонар Марата. Але што яна ўяўляе сабой цяпер, немагчыма выказаць словамі…»

Загадкі пачаліся адразу, у працэсе пошуку вуліцы Марата Казея. Яна аказалася сапраўдным фантомам. На адной карце сталіцы, выдадзенай два гады таму, гэты тапонім адсутнічае ўвогуле. У другім атласе Мінска вуліца Казея ў паказальніку значыцца, але непасрэдна на карце не падпісана. Крыху праясніў сітуацыю план мясцовасці, знойдзены на сайце адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Мінска, з якога ўдалося сёе-тое запазычыць. Аказалася, што паміж прамысловай зонай на поўдні Кастрычніцкага раёна Мінска і чыгункай на Асіповічы заціснуты дзве невялічкія вуліцы — Вілкаўшчына і Марата Казея.

Сталічная вуліца імя Марата Казея нагадвае хутчэй лясную сцежку, але з ліхтарамі.

СТАР. 4

■ Пенсіі

ПЕРАЎТВАРЭННІ — ТОЛЬКІ ПАСТУПОВЫЯ

Радыкальных узрушэнняў у пенсійнай сістэме ў 2014 годзе не будзе.

Пенсійная сістэма, па словах **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Мінпрацы і сацабароны Ларысы ЯШКОВАЙ,** — гэта не сфера для эксперыментаў. Сёння дзяржава гарантуе суадносіны пенсіі па ўзросце да сярэдняга заробку работнікаў на ўзроўні 40% (гэта міжнародны стандарт) і выплату пенсій ва ўстаноўленыя тэрміны і ў поўным аб'ёме.

— Мы вельмі асцярожна ставімся да пытання ўдасканалення пенсійнага забеспячэння, праблем збалансаванага функцыянавання пенсійнай сістэмы ў доўгатэрміновай перспектыве. У нас пераўтварэнні ў пенсійнай сферы ажыццяўляюцца пакрокава, павольнымі тэмпамі, але ўпэўнена, — заявіла Ларыса Яшкова.

Што тычыцца 2014 года, то плануецца з дапамогай персаніфікаванага ўліку спрасціць механізм збору дакументаў для прызначэння пенсіі. Акрамя таго, з мэтай спрашчэння адміністравання выплаты пенсіі па міжнародных дагаворах будзе пашыраны электронны дакументаабарот з Расіяй, Латвіяй і Літвой.

З новаўвядзенняў — павелічэнне з 1 студзеня гэтага года мінімальнага стажу працы, неабходнага для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце і за выслугу гадоў, — з 5 да 10 гадоў. У перспектыве такі стаж паступова будзе павялічвацца і далей, а ў будучыні, хутчэй за ўсё, будзе прывязаны да сярэдняга перыяду атрымання пенсіі. Ранейшыя ўмовы па мінімальным стажы захаваны для прызначэння датэрміновых пенсій па ўзросце бацькам інвалідаў з дзяцінства, шматдзетным маці, інвалідам з дзяцінства і некаторым іншым катэгорыям грамадзян, а таксама пенсій па інваліднасці і з нагоды страты карміцеля.

У гэтым годзе будзе працягвацца работа па павышэнні памераў працоўных пенсій.

Паводле слоў спецыяліста, будуць забяспечвацца суадносіны сярэдняй пенсіі па ўзросце з сярэднім заробкам работнікаў на ўзроўні 40%, сярэдняй мінімальнай пенсіі — на ўзроўні БПМ пенсіянера.

Святлана БУСЬКО.

■ Добрая навіна

6,1 млн рублёў за «квадрат»

Гэтымі днямі ў нашай краіне павялічыўся гранічны нарматыў кошт аднаго квадратнага метра жылля для атрымання льготнага крэдыту на нерухомасць — з 5,3 млн да 6,1 млн рублёў. Такія лічбы вызначаны пастановай Савета Міністраў №1191 ад 31 снежня 2013 года, якая апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Такім чынам, сёлета істотна павялічваюцца памеры льготных крэдытаў пад будаўніцтва жылля для чаргавікоў. У дакуменце гаворыцца аб вызначаным законам максімуме цэнніка квадратнага метра, які банк улічвае пры разліку максімальнага памеру льготнага крэдыту на будаўніцтва або набыццё жылога памяшкання. Розніцу паміж гэтай велічынёй і рэальным коштам аднаго «квадрата» льготнік кампенсуе за кошт уласных сродкаў або шляхам дадатковай пазыкі па лініі камерцыйнага крэдытавання.

Нагадаю, што сёлета беларускія банкі плануюць выдаць насельніцтву крэдытныя рэсурсы для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў на агульную суму ў памеры 15,802 трлн рублёў, з якіх 14,764 трлн рублёў будуць выдадзены па сістэме льготнага крэдытавання. Цяпер ільготнікаў у краіне крэдытуюць два банкі — Беларусбанк і Белаграпрамбанк. Дарэчы, ільготны крэдыт на жыллёвую нерухомасць, згодна з Указам №13, могуць атрымаць малазабяспечаныя грамадзяне-чаргавікі «са стажам», шматдзетныя і маладыя сем'і, вайскоўцы, чарнобыльцы, інваліды і іншыя сацыяльна неабароненыя катэгорыі грамадзян. У мінулы раз нарматыў жыллёвага «квадрата» для банкаў павялічваўся з 4,6 млн рублёў да 5,3 млн рублёў летась у кастрычніку.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Учынак

«ЛЁД ХРУСЦЕЎ, А Я ПОЎЗ»

Аляксандр Жолудзеў выратаваў… траіх, але героем сябе не лічыць

Пра тое, што ў Віцебску малады чалавек выратаваў хлопчыка, які мог патануць у рацэ Віцьба, «Звязда» ўжо паведамляла. Нагадаем, што недалёка ад цэнтра горада пяцікласнік, які катаўся на санках з горкі, праваліўся пад лёд на рацэ. Адбылося гэта а чацвёртай гадзіне дня на праспекце Люднікава ў раёне аўтамабільнага моста «Юбілейны» цераз раку Віцьба. Вучань 5 класа сярэдняй школы № 28 потым растлумачыў, што санкі заехалі на лёд і ён пайшоў іх даставаць. На адлегласці трох метраў ад берага і здарылася бяда.

Выратаваў хлопчыка 21-гадовы жыхар абласнога цэнтра Аляксандр Жолудзеў. Ці разумеў ён, што сам можа патануць? Што адчуваў, калі кінуўся на дапамогу? Аб гэтым і іншым наш карэспандэнт распытаў героя. Што цікава: ён аказаўся… суседам аўтара гэтых радкоў — жыве ў доме на праспекце Люднікава.

— Так, плаваць я, вядома, умею — другі разрад маю. У школьныя гады запомніліся заняткі па прадмеце «Асновы бяспекі жыцця». Памятаю, як прафесійныя выратавальнікі расказвалі, што трэба рабіць, калі, не дай Бог, нешта здарыцца… Бачыце, спатрэбілася. А ў той дзень выпадкова ўсё адбылося. Я і мой таварыш ішлі па мосце. Раптам пачулі гучныя крыкі аб дапамозе. З моста, з вялікай вышыні ў вадзе я нічога не бачыў, бо ў мяне са зрокам праблемы. Заўважыў спачатку санкі… Мы пабеглі на крык. Хвіліны за тры дабеглі да берага. Я скінуў куртку, абутак, лёг на лёд, дапоўз да палонкі… Калі б ішоў, а не поўз, з маёй вагой 90 кілаграмаў мог бы, напэўна, праваліцца ў ваду. Лёд хрусцеў, а я поўз, — расказвае Аляксандр.

Калі ўжо выцягнуў малога з вады, да месца надзвычайнага здарэння падышлі жанчына і хлопец. Першая зняла з сябе кашулю і надзела на хлопчыка, а малады мужчына даў яму куртку. Апошні і выклікаў выратавальнікаў і «хуткую». Каб сагрэцца, пакуль чакалі прыезду спецыяльных службаў, зайшлі ў будынак аўтазапраўкі. Як расказаў Саша, ён вельмі замерз тады. На «хуткай» хлопчыка павезлі ў бальніцу. А прадстаўнік МНС запісаў імя, прозвішча і адрас выратавальніка.

Папрасіў героя трохі расказаць пра сябе.

— Вучыўся ў віцебскай сярэдняй школе № 3, скончыў ліцэй № 1 па спецыяльнасці «аператар станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем». Паўгода папрацаваў станочнікам на віцебскім заводзе «Эвістар», трохі ахоўнікам — у забаўляльнай установе. Зараз, можна сказаць, шукаю працу па душы. Халасты, — сціпла расказвае хлопец.

Як паведамілі «Звяздзе» ў **Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях,** па добрай традыцыі такіх неабыякавых і смелых людзей, якія прыходзяць на дапамогу іншым, звычайна заахвочваюць. Праўда, Аляксандр не лічыць, што заслужыў чагосьці. Яго больш хвалюе здароўе хлопчыка.

— Я раней яго не ведаў. Толькі ад журналісткі з тэлебачання, якая на наступны дзень гутарыла са мной, даведаўся, што ў хлопчыка па імені Ігар усё добра. А потым у тэлевізійных навінах пачуў, як доктар расказваў, што малога хутка выпішуць. Можа, сёння пад'еду ў бальніцу да Ігарка, пагляджу, як ён.

Напрыканцы размовы хлопец прызнаўся, што… і раней выратоўваў людзей, якія танулі. Летам мінулага года разам з сябрамі выцягнулі з ракі мужчыну. І каля дачы, у вёсцы Межава Аршанскага раёна, дастаў з вады дзяўчыну. Упэўніўшыся, што з гэтымі людзьмі ўсё добра, наш герой сціпла сыходзіў.

Словам, Аляксандр — малайчына! Ён здольны імгненна прымаць правільныя рашэнні і рабіць «звычайныя цуды»!

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Год гасціннасці, на думку Міхаіла Мясніковіча, неабходна вярнуцца да выканання патрабаванняў Дырэктывы № 4. «Прадпрымальніцтва, развіццё сферы паслуг у гэты год павінны стаць важнейшымі фактарамі эканамічнага росту», — адзначыў ён. Таму тыя заданні, якія ўстаноўлены ў адносінах да мясцовых органаў улады па павелічэнні долі малога і сярэдняга бізнесу ў валавым рэгіянальным прадукце, павінны быць не проста нейкімі пажаданнямі — у гэтым напрамку павінна быць праведзена пэўная работа, перакананы прэм'ер.

Ён са шкадаваннем канстатаваў недастатковасць той падтрымкі, якая цяпер аказваецца мясцовымі органамі ўлады малому і сярэдняму бізнесу. Патэнцыял ёсць значна большы. У сувязі з гэтым віцэ-прэм'еру Пятру Пракаповічу дадзена даручэнне сумесна з бізнес-саюзамі і саветам па развіцці прадпрымальніцтва падрыхтаваць мэтавы разгляд гэтага пытання на пасяджэнні Савета Міністраў. Таксама Міхаіл Мясніковіч паставіў задачу ў бліжэйшы час завяршыць работу па продажы арандатарам арандаваных імі памяшканняў. Больш актыўна павінна весціся і работа па ўключэнні ў абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца або неэфектыўна выкарыстоўваецца. Гэта неабходна рабіць ва ўзаемадзеянні з малым і сярэднім прадпрымальніцтвам.

Асноўны аб'ём дзяржпадтрымкі ў гэтым годзе будзе накіраваны на падтрыманне экспарту і мадэрнізацыю. У сувязі з гэтым прэм'ер яшчэ раз нагадаў, што мадэрнізацыя павінна весціся паўсюль. Пры гэтым акцэнт павінен быць зроблены на эфектыўныя і акупныя праекты.

Усяго на падтрымку прамысловасці сёлета будзе накіравана Br45 трлн ільготных крэдытаў і Br4,8 трлн бюджэтных сродкаў. Вялікая ўвага будзе ўдзелена зніжэнню імпарту (у першую чаргу спажывецкага і прамежкавага). Таксама будзе ўзмоцнена адрасная падтрымка насельніцтва.

Усе пералічаныя напрамкі, паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, патрабуюць напружанай работы ўсіх членаў урада, а таксама вертыкалі ўлады.

■ Ну і ну!

Долары — замест рублёў. З банкамата

Калі з дапамогай банкаматаў махляры здымаюць грошы з рахункаў людзей, гэта ўжо даўно не сенсацыя. А вось навіна пра тое, што ў Брэсце памыліўся банкамат і выдаў нашмат больш, чым прасілі, імгненна абляцела ўсе сайты. А брастаўчанцы, якой злашчасны банкамат спрабаваў выдаць валюту, гэта прынесла адны толькі клопаты і папсавала нервы.

Супрацоўніца кампаніі «Санта Брэмар» зайшла ў банкамат «Масква-Мінск», каб зняць зарплату, але замест замоўленых рублёў машына стала выдаваць ёй долары. Наталля прасіла пяць мільёнаў беларускіх рублёў, ёй выдалі 2700 долараў. Яна адразу стала званіць у свой банк, чыёй карткай карыстаецца. Але была нядзеля — ніхто з кліенткай гаварыць не стаў. У панядзелак жанчына пайшла ў міліцыю. Усе разборы, пісьмовае тлумачэнне, іншыя фармальнасці ўжо ў самім банку занялі паўдня. Потым ёй, нарэшце, выдалі патрэбную суму ў беларускіх рублях і забралі валюту, якая сапсавала настрой і выхадны дзень. Бо Наталля адразу пасля наведвання банкамата хацела паехаць у краму, каб купіць даўно нагледжаную рэч. Усё давялося адкласці. Потым у банку жанчыне сказалі, што гэта першы падобны выпадак у іх практыцы. Машына ёсць машына: яна, здараецца, дае збой.

Яна СВЕТАВА

■

■ Першачарговыя задачы

З «праблемнымі» дамамі навесці элементарны парадак

Надзённыя пытанні працы будаўнічага комплексу разгледжаны ўчора ў Гродне на семінары з удзелам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандра ЯКАБСОНА, старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА, кіраўнікоў мясцовых органаў улады і прадпрыемстваў. Дадзены тлумачэнні літаральна па ўсіх элементах арганізацыі будаўнічага працэсу — ад моманту выдзялення зямельнага ўчастка да ўводу аб'ектаў у эксплуатацыю.

Акрамя таго, увазе ўдзельнікаў семінара была прапанавана вялікая выстава з узорамі матэрыялаў, што вырабляюцца на Гродзеншчыне для будаўнічага комплексу.

— Як бачым, у нас сёння ёсць усё, каб будаваць якасна і ў тэрмін, — зазначыў Аляксандр Якабсон.

Але чаго ж не хапае?

Ключавыя праблемы ў цэлым па краіне — зрыў тэрмінаў будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў, недастатковае і нерытмічнае фінансаванне будоўляў па прычыне неўкамплектаванасці ЖБСК, масавая адмова ад будаўніцтва дамоў у саставе кааператываў з-за высокага кошту квадратнага метра, а таксама элементарныя пралікі органаў выканаўчай улады ў выбары падрадчыкаў.

Паводле ацэнкі Аляксандра Якабсона, Гродзеншчына па пытаннях «праблемных» дамоў летась выглядала лепш за іншых. Па стане на пачатак лістапада 2013 г. у вобласці сярод праблемных значыўся 31 дом. Дзякуючы сумесным намаганням органаў мясцовай улады, міжведамаснай рабочай групы па пытаннях працы будаўнічага комплексу і іншых зацікаўленых усе гэтыя дамы да пачатку новага года былі ўведзены ў эксплуатацыю. Аднак у студзені з'явілася 8 новых звышнарматыўных жылых аб'ектаў. Гэтую праблему трэба разглядаць як надзвычайнае здарэнне, і яе вырашэнне павінна стаць першачарговай задачай на першае паўгоддзе, падкрэсліў Аляксандр Якабсон. Мала проста прызначыць тэрміны ўводу праблемных дамоў — неабходна мець дакладны план будаўніцтва па кожным аб'екце, з вызначэннем крыніц фінансавання, размеркаваннем працоўных і матэрыяльных рэсурсаў будаўнічых арганізацый.

Ужо прыняты шэраг указаў, дзе вызначана схема дзеянняў (крок за крокам), каб не дапускаць памылак у будаўніцтве — што датычыцца тэрмінаў, якасці работ, фінансавання, выдзялення зямельных участкаў і г. д. «Правілы гульні», якія раней, магчыма, былі недакладна прапісаны ў шматлікіх нарматыўных актах, сёння аб'яднаны ў некалькі дакументаў — у так званую дарожную карту будаўніцтва. Гэта, лічыць Аляксандр Якабсон, простыя і даступныя рэчы для любога, у тым ліку і маладога спецыяліста: маўляў, глядзі і па пунктах працуй.

У гэтых дакументах дакладна ўказана, чаго не павінна быць у будаўнічым комплексе.

— Не павінна быць выпадковых людзей як у службе заказчыка (будзе адпаведная атэстацыя такіх падраздзяленняў), так і сярод падрадчыкаў — арганізацый, якія прыходзяць на будоўлю, нічога не маючы за душой і ліхаманкава шукаюць сабе рабочую сілу, тэхніку. Не павінна быць выпадковых праекціроўшчыкаў, якія бяруцца за аб'ект, не ведаючы, з якога боку да яго падысці. Трэба навесці жалезны, элементарны парадак у будаўнічым комплексе, на што і накіраваны нарматыўныя дакументы, падпісаныя кіраўніком дзяржавы. І калі гэтыя правілы будуць дакладна выконвацца, то ёсць упэўненасць, што ў далейшым не будзе такой праблемы, як нясвоечасовае будаўніцтва аб'ектаў і іх увод у эксплуатацыю, — зазначыў Аляксандр Якабсон.

Неабходна сачыць за тым, каб фінансаванне было своечасовым і не распылялася па ўсёй наменклатуры, а выдзялялася ў строгай адпаведнасці з інвестыцыйнай праграмай. Важна і тое, што новае будаўніцтва жылля для грамадзян, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў і аднаразовых субсідый на будаўніцтва альбо набыццё жылых памяшканняў, будзе ажыццяўляцца, як прадугледжана Указам № 215, толькі па дзяржаўным заказе. Такі парадак, на думку Аляксандра Якабсона, павінен, у прынцыпе, выключыць з'яўленне «праблемных» дамоў. Пры гэтым кошт квадратнага метра такога жылля павінен адпавядаць сярэднямесячнай зарплаце ў рэспубліцы з карэкцыяй на ўстаноўлены каэфіцыент. А як укласціся ў такія параметры з нашымі празмернымі затратамі — першачарговая задача галіновых міністэрстваў, кіраўнікоў прамысловых і будаўнічых арганізацый.

Яшчэ адна сур'ёзная праблема — розныя злоўжыванні ўдзельнікамі будаўнічай сферы. Толькі летась праваахоўныя структуры выявілі ў гэтай галіне больш за 450 злачынстваў, большасць з якіх звязана з карупцыйнымі праявамі, выкарыстаннем ілжэструктур з мэтай уходу ад падаткаў, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА № 0491845, № 0439627, № 0439628 **считать недействительными.** УНП 100964704

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту ««Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями общественного назначения по генплану №№ 12, 13,14, 20 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко». 2-я очередь строительства. Жилой дом № 12 по генплану»,

опубликованную в газете «Звязда» 29.11.2013 года»

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БелБизнесРесурс», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 15 декабря 2006 г. № 2548 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190782901.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 3, кабинет 6.

Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц в жилом доме № 12 по ГП:

2-, 3-комнатные квартиры – при оплате в рассрочку 1450 (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1350 (Одна тысяча триста пятьдесят) долларов США.

4-комнатные квартиры (2-уровневые от 138 м^2) в рассрочку 1300 (одна тысяча триста) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1250 (Одна тысяча двести пятьдесят) долларов США.

УНП 190782901

ФАКТЫ

«МАБІЛЬНЫ» ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ПРАВОЎ СПАЖЫЎЦА

Сёлета Сусветны дзень абароны правоў спажыўца, які адзначаецца 15 сакавіка, пройдзе пад дэвізам «Забеспячэнне абароны правоў спажыўца мабільнай сувязі».

«З развіццём мабільных камунікацый, шырокім распаўсюджваннем сотавай сувязі, пашырэннем спектру паслуг у Рэспубліцы Беларусь павялічылася колькасць зваротаў спажыўцоў па пытаннях якасці сувязі, навязвання паслуг (напрыклад, паслуг галасавой сувязі), неправамернага адключэння абанентаў ад паслуг сотавай сувязі пры наяўнасці запазычанасці па аплаце інфармацыйна-даведачных паслуг, парушэння парадку змянення і скасавання дагавораў, распаўсюджвання рэкламы праз сотавую сувязь і г. д.»

У Міністэрстве гандлю адзначаюць, што павышэнне ўвагі грамадскасці да пытанняў якасці паслуг сотавай сувязі можа даць станоўчы эфект для вырашэння праблемных пытанняў у гэтай сферы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ФАНІЎ» ФРАГМЕНТ ПРЫБОРА…

На ААТ «Белколермет» у пасёлку Гатава пад Мінскам выяўлена крыніца радыяцыйнага выпраменьвання.

Пра перавышэнне радыяцыйнага фону, выяўленага пры правядзенні праверкі металу на адкрытай пляцоўцы прадпрыемства, паведаміў галоўны інжынер. На месцы было ўстаноўлена, што пры праходжанні грузавым аўтамабілем з каляровымі металамі (дробныя запчасткі ад прыбораў) зоны мытнага кантролю ручны прыбор для вымярэння радыяцыйнага фону зафіксаваў перавышэнне ўзроўню радыяцыі. Пасля разгрузкі аўтамабіля і правядзення работ па пошуку магчымай крыніцы радыяцыйнага выпраменьвання работнікамі хімічнай службы рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС быў знойдзены фрагмент прыбора дыяметрам 10 сантыметраў, даўжынёй 6 сантыметраў. Прадмет змясцілі ў герметычны кантэйнер і вывезлі для далейшай утылізацыі. Сярод рабочых пацярпелых не было, тэхналагічны працэс прадпрыемства не парушаўся.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАПАЛІСЯ НА «ВАЛЮЦЕ»

У Бабруйску падчас буйной здзелкі затрыманы валютчык і яго кліентка.

Аб гэтым газеце паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК РБ па Магілёўскай вобласці Аляксандр Шаройкін. Пяцідзесяцігадовы мужчына збіраўся памяняць мясцовай жыхарцы 27 тысяч долараў ЗША на расійскія рублі.

Устаноўлена, што валютчык, нідзе не працуючы на працягу доўгага перыяду часу, «прафесійна» займаўся скупкай, продажам і абменам замежнай валюты. Раней ён неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне парадку ажыццяўлення валютных аперацый. На гэты раз, акрамя прызначаных для здзелкі 27 тысяч долараў ЗША і 873 830 расійскіх рублёў, у мужчыны было канфіскавана каля 2 тысяч долараў, 505 еўра, больш за 913 тысяч расійскіх і 4,2 мільёна беларускіх рублёў — усяго на агульную суму 550 мільёнаў рублёў.

За незаконны абмен замежнай валюты ўдзельнікам «паражае» адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй прадмета правапарушэння. А ў дачыненні да «валютчыка» разглядаецца пытанне аб завядзенні крымінальнай справы за сістэматычны занятак незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

НАВІНЫ

МІНАКІ ЗАТРЫМАЛІ РАБАЎНІКА-РЭЦЫДЫВІСТА

Увечары на вуліцы Багдановіча ў сталіцы на 50-гадовую мінчанку напаў 30-гадовы жыхар Вілейкі.

Ён вырваў з рук жанчыны сумачку, у якой, апроч іншага, знаходзілася каля мільёна рублёў і мабільны тэлефон, і паспрабаваў збегчы. Аднак у гэтым зламысніку перашкодзіў выпадковы сведка, які паспрабаваў затрымаць нападаўшага, паведамілі ў Савецкім РУУС г. Мінска. Праўда, фізічна больш моцнаму рабаўніку напачатку ўдалося вырвацца, аднак на дапамогу незнаёмцу прыйшоў яшчэ адзін відавочца. Удвух яны затрымалі злачынцу і ўтрымлівалі яго да прыбыцця міліцэйскага наряда. Як высветлілася, затрыманы ўжо быў раней судзімы за крадзяжы і рабаванне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НІ ДАЦЬ, НІ ЎЗЯЦЬ

Заведзена крымінальная справа за спробу дачы хабару інспектару Брэсцкай мытні.

Жыхарка горада Стоўбцы ехала поездам Львоў — С.-Пецярбург з багажом, што значна перавышаў вагу 100 кілаграмаў: жанчына везла з Украіны тавары. А мытныя зборы ёй плаціць не хацелася, і яна задумала вырашыць гэтую праблему інакш. У пункце мытнага афармлення «Гарынь» грамадзянка паціху паклала ў кішэню куртакі мытнага інспектара купюру вартасцю 100 еўра. Але інспектар тут жа выклікаў праваахоўнікаў, якія канфіскавалі валюту як рэчавы доказ.

Яна СВЕТАВА.

ПАДЗЕІ

■ Дзеці адной зямлі

У СУЛАДДЗІ, ЗГОДЗЕ І ТВОРЧАСЦІ

Аб шматнацыянальнай Беларусі цяпер можна прачытаць і па-англійску, а казкі народаў нашай краіны плануецца выдаць па-беларуску

Ці ведаеце вы, дзе ў нашай краіне падрастае «інтэрнацыянальны» лес? Маленькія елачкі, якія зараз толькі набіраюць моц, летась у Валожынскім лясгасе пасадзілі грэкі, украінцы, чувашы, грузіны, літоўцы, рускія, палякі, немцы, татары, туркмены, для якіх Беларусь стала другой Радзімай. І гэта толькі адно з многіх мерапрыемстваў, якія праводзіліся з удзелам прадстаўнікоў нацыянальна-грамадскіх аб'яднанняў нашай краіны па ініцыятыве апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

Наогул, як расказаў сам **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід ГУЛЯКА** *(на фота)*, зроблена было нямала. Напрыклад, дзякуючы сродкам, выдзеленым з рэспубліканскага бюджэту, пабачыла свет ужо трэцяе выданне альбома «Беларусь шматнацыянальная» — своеасаблівы даведнік аб дзейнасці, звычаях, святах дыяспар, што існуюць на тэрыторыі нашай краіны. Прычым, у адрозненне ад папярэдніх выданняў, маляўніча ілюстраваны альбом дапоўнены: да беларускага і рускага тэксту дадалася англійская версія перакладу. Такое выданне сапраўды не сорамна паказаць гасцям, якія сёлета прыедуць да нас з усяго свету, і многія з якіх, напэўна, нават не здагадваюцца, што ў невялікай па плошчы краіне ў міры і згодзе пражываюць больш за сто сорак нацыянальнасцяў.

Менавіта таму, што аб жыцці дыяспар Беларусі ў свеце ведаюць зусім няшмат, па ініцыятыве апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў прадстаўнікі нашых нацыянальна-культурных аб'яднанняў пачалі выязджаць у іншыя краіны і сустракацца там са сваімі «калегамі». У 2012-м яны пабывалі ў Літве, а летась — у Польшчы і ва ўкраінскім Львове. «Такім чынам мы даём магчымасць і грамадскасці, і нярэдка скептычна настроенай прэсе гэтых краін пагаварыць непасрэдна з прадстаўнікамі нашых нацыянальных меншасцяў, распытаць у іх пра жыццё, пра магчымасці, якія яны тут маюць», — тлумачыць вынік падобных паездак Леанід Гуляка. «Калі мы расказваем аб тым, з якой павагай і разуменнем у Беларусі ставяцца да прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцяў, нам па-добраму зайздросцяць», — гаворыць удзельнік падобных паездак **старшыня кансультатыўнага міжэтнічнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Георгій ЕГІЯЗАРАН.**

Уласна кажучы, сапраўды зайздросціць ёсць чаму: беларусы заўжды паважалі і прымалі як сваіх тых, хто прыходзіць на гэту зямлю з добрымі намерамі. Аб гэтым сведчаць і вынікі сацыялагічных апытанняў. Паводле слоў **намесніка дырэктара інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Льва КРЫШТАПОВІЧА,** адносіны ў міжнацыянальнай сферы ў нашай краіне абсалютная большасць апытаных — 95 працэнтаў — ацэньвае як спакойныя і неканфліктныя. Прычым паказчык гэты застаецца стабільным з 2007 года, калі пачалося вывучэнне грамадскай думкі на гэты конт. Гэта, на думку сацыёлага, найлепш сведчыць пра выверанасць і паслядоўнасць дзяржаўнай палітыкі не толькі ў сферы міжнацыянальных зносін, але і ў іншых сферах жыцця грамадства.

У такой спакойнай мірнай сітуацыі ёсць месца для цікавых ідэй і для творчасці. Гэты год для прадстаўнікоў дыяспар несумненна пройдзе пад знакам X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, да якога зараз усе актыўна рыхтуюцца. Але ёсць і ўласныя цікавінкі. Да прыкладу, літоўцы ладзяць цікавыя мерапрыемствы да 300-годдзя пачынальніка нацыянальнай літаратуры Крысціёнаса Данелайціса, палякі плануюць сёлетні фестываль «Аўгустоўскі канал» правесці не толькі на беларускім баку, але і на польскім, міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Гора», у складзе якога і дагестанцы, і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, запрашаюць да ўдзелу ў сваіх выступленнях Дзяржаўны акадэмічны хор Беларусі імя Цітовіча…

А **Сяргей МУСІЕНКА** (не як кіраўнік Аналітычнага цэнтра ЕсооМ, а як прадстаўнік нацыянальна-культурнага грамадскага аб'яднання) расказаў пра яшчэ адзін цікавы праект — выданне кнігі «Казкі шматнацыянальнай Беларусі», у якім будуць змешчаны ў перакладзе на беларускую або рускую мову самыя цікавыя казкі розных народаў. Ілюстрацыяй да гэтага выдання могуць стаць дзіцячыя малюнкі: малыя грамадзяне Беларусі такім чынам ужо з ранніх гадоў далучацца да шматграннасці і багацця нашай шматнацыянальнай культуры. Леанід Гуляка паабяцаў, што гэтая прапанова будзе ў хуткім часе абавязкова разгледжана.

Што датычыцца праекта Закона «Аб беларусах замежжа», пра які нямала гаварылася, Леанід Гуляка выказаў упэўненасць, што ён будзе прыняты сёлета, зазначыўшы пры гэтым, што і цяпер апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў працуе ў прававым рэчышчы, палажэнні якога прапісаны ў законапраекце.

Алена ЛЯЎКОВІЧ

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ГУ «Управление бытового обслуживания населения Минской области» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды объектов недвижимого имущества

Лот	Описание
Наименование Объекта (сведения о продаваемом имуществе)	**Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (ангар инв. № 0003), площадью 89,0 кв.м; здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (ангар, инв. № 0004), площадью 93,5 кв.м.**
Местонахождение Объекта	г. Минск, ул. Инженерная, 8
Земельный участок, на котором располагается Объект	Кадастровый номер 500000000002003473, площадь 0,9204 га (предоставлен в общую долевую аренду)
Срок договора аренды Объекта	3 года
Начальная цена продажи права	3 923 750 бел. руб.
Сумма задатка	392 350 бел. руб.
Шаг аукциона	10%
Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта	(0,5х0,6х2,0)х182,5=109.5 базовой арендной величины
Обременения, связанные с Объектом, земельным участком, на котором располагается Объект	Охранные зоны: ЛЭП, магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений.
Условия (при наличии) продажи Объекта аукциона	Использование объекта по целевому назначению. Содержание территории в соответствии с требованиями СНиП.

Задаток перечисляется на р/с № 3012108260016; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор аренды должен быть заключен в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Оплата за объект производится в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.10.2013 г.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **28.01.2014 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 27.01.2014 до 16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Минский агросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества (в комплексе):

Наименование	общ. пл., кв.м	инв. №
арочник № 1	688	600/С – 139360
арочник № 2	692	600/С – 139352
арочник № 3	537,3	600/С – 139351
здание санитарно-бытовое	18,6	600/С – 141587
компрессорная	6,9	600/С – 141567
помещение щитовой 380/220	7,7	600/С – 141586
эстакада бетонная, 15м*1,5м*2м; асфальтобетонная площадка площадью 561 кв.м; благоустроенная асфальтная площадка площадью 2106 кв.м; забор панельный с въездными воротами; ворота металлические, 4м*3м; наружные сети водопровода (нержавеющая сталь, d = 50мм, протяженность 300м); низковольтная кабельная электрическая сеть (марка кабеля АВВГ 4*70, протяженность 250 м, 380Вт)		
Станок деревообрабатывающий; счетчик электроэнергии 3-фазный «Энергомера СЕ301», № 404213; установка для обработки древесины; станок торцовочный; станок круглопильный деревообрабатывающий; станок деревообрабатывающий ФСШ-1А; подъемник КП-317; рама лесопильная Р63-4Б; бункер-накопитель для опилок; электрощит к станку; станок СФ-4; вагон-дом; здание мобильное; гараж; бункер для цемента.		

Указанное имущество расположено на земельном участке общей площадью 2.3873 га (предоставлен на праве постоянного пользования) с кадастровым номером 623655500001000307 по адресу: Минская обл., Минский р-н, район г.п. Мачулищи.

Начальная цена с НДС – 7 283 953 620 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (728 395 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 690324015, ОКПО 29250255 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» 19.11.2013 г.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **31.01.2014 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 30.01.2014 г. до 16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

Вуліца-прывід

Анклаў пасярод мегаполіса

— Шчыра кажучы, па колішняй вёсцы Вілкаўшчына пытанняў пакуль застаецца больш, чым адказаў, — гаворыць гісторык Іван Сацукевіч. — Напрыклад, дагэтуль не вызначана дакладная дата яе ўзнікнення. Можна з упэўненасцю сказаць толькі адно: да катэгорыі старажытных яна не адносіцца. Мяркуецца, што вёска з'явілася ў першай палове мінулага стагоддзя. Каля цагляных заводаў на поўдзень ад тагачасных межаў Мінска ўзнікла некалькі такіх невялічкіх паселішчаў, якія пасля пайшлі пад бульдозер. А вось гэтая вёсачка засталася адзінай, якая дацягнула да нашых часоў. Пасля таго, як яе паглынуў Мінск, абедзве вуліцы атрымалі назвы — Вілкаўшчына і Марата Казея адпаведна. Але напрыканцы савецкай эпохі паселішча апынулася ў своеасаблівай пастцы. З трох бакоў яго глухой агароджай абкружылі завод «Керамін» і новая прамысловая зона. З чацвёртага — чыгунка Мінск — Асіповічы. Абедзве вуліцы Вілкаўшчыны не перасякаліся з іншымі сталічнымі дарогамі — так вёска ператварылася ў сапраўдны анклаў пасярод горада…

Руіны жылых дамоў. Іх там шмат...

Падарожжа ў закінуты свет

Цяпер, у XXI стагоддзі, зусім не верыцца ў тое, што вуліца імя Марата Казея знаходзіцца не ў чарнобыльскай зоне, а ў сталіцы еўрапейскай дзяржавы. Каб дабрацца да яе, трэба спярша прайсці праз выцягнуты ўздоўж лініі чыгункі гаражны кааператыў прыкладна каля кіламетра. Але нават калі ехаць на легкавым аўтамабілі, то далей гаражоў не заедзеш таксама. Дарогі ў звыклым нам сэнсе там не існуе. Яе ролю выконваюць дзве глыбокія каляіны, якія пакінуў трактар.

Перабраўшыся праз выкапаную траншэю, трапляю нібыта ў закінуты свет. Навокал усё парасло бур'янам і густым хмызняком. Абрысы колішняй вуліцы Вілкаўшчыны, тым не менш, угадваюцца. Пра тое, што тут калісьці цеплілася жыццё ды гучалі чалавечыя галасы, нагадваюць хіба што руіны некалькіх прыватных дамоў. У поле зроку трапляюць сляды вогнішчаў. Каля іх раскіданы ўпакоўкі з-пад ежы і пустыя бутэлькі.

Выходжу ў пачатак вуліцы Марата Казея. Што і казаць, пра ваеннае ліхалецце яна добра нагадвае і сёння. Ды толькі не мемарыяльнай дошкай у памяць піянера-героя, а напаўразбуранымі дамамі, у якіх быццам бы рваліся бомбы… На выпадковага падарожніка яны пазіраюць пустымі вачніцамі выбітых вокнаў. У некаторых дамах унутры нават пачалі расці дрэвы. Побач — спустошаныя гаспадарчыя пабудовы.

Як ні дзіўна, над гэтым закінутым астраўком узвышаюцца бетонныя ліхтарныя слупы, якія старымі не выглядаюць. Стаіць і калонка, з дапамогай якой жыхары калісьці здабывалі ваду. Побач з ёй чарнее глыбокі, нічым не агароджаны правал.

І над усім гэтым — ні гуку. Тут царства амаль абсалютнай (у выхадны дзень!) цішыні. Толькі прагрукоча ледзь чутна цягнік… Хоць чыгунка адсюль і не так далёка, метрах у 300, але яе пасажырам разгледзець на хуткасці з акна вагона пакінутую Вілкаўшчыну вельмі складана нават узімку. Улетку ж кроны шматлікіх дрэў ды густыя кусты надзейна хаваюць забыты квартал ад залішне цікаўных вачэй.

— Яшчэ не так даўно на гэтых вуліцах стаяла некалькі дзясяткаў аднапавярховых жылых дамоў. Апошні з іх знік яшчэ гадоў пяць таму, — паведаміла **начальнік упраўлення архітэктуры і будаўніцтва адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Алена СУХАДОЛАВА.** — Вёска была прызнана непрыдатнай для пражывання людзей. Да яе не існавала нармальнага пад'езду. Акрамя таго, праз яе прайшла санітарна-ахоўная зона размешчаных паблізу прамысловых прадпрыемстваў. Усё гэта і паўплывала на прыняцце рашэння аб адсяленні. Цяпер жа тэрыторыя Вілкаўшчыны аддадзена пад інвестыцыйныя пляцоўкі. Там плануецца размяшчэнне двух аб'ектаў — вытворчага і камунальна-гандлёвага характару. Калі гэтыя пляцоўкі стваралі ся, то яны прывязваліся да вуліц, што існавалі калісьці. Таму фармальна вуліца Марата Казея там ёсць і цяпер, але на новых картах яе не адшукаць.

Замест эпілога

Зусім хутка Беларусь урачыста адсвяткуе 70-годдзе вызвалення ад нямецкіх акупантаў. І на гэтым фоне зусім непрыглядны стан сталічнай вуліцы імя Героя Савецкага Саюза Марата Казея (дакладней кажучы, таго, што ад яе засталося) уносіць вельмі моцны дысананс. Чаму б да будучага юбілею не выправіць гэтую сумную недарэчнасць? Напрыклад, назваць у гонар самага вядомага беларускага піянера-героя прыгожую вуліцу ў адным з новых мікрараёнаў…

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У закінутых пабудовах растуць дрэвы.

Даведка «Звязды»

У трынаццацігадовым узросце Марат пайшоў партызаніць у атрад імя 25-годдзя Кастрычніка. Удзельнічаў у шматлікіх рэйдах і дыверсіях супраць нямецкіх акупантаў. Быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені ды медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі». Калі ён вяртаўся з чарговай разведкі, яго абкружылі фашысты. Падарваў сябе і ворагаў гранатай. У 1958 годзе ў парку імя Янкі Купалы ў Мінску з'явіўся помнік юнаму патрыёту, устаноўлены на сродкі, якія сабралі беларускія піянеры. У 1965 годзе Марату Казею было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

■ Крытыка на шпільцы

Лепшыя кнігі 2013 года

Дзіўна, але апошні раз кнігу на беларускай мове ў падарунак я атрымала ў дзяцінстве, яшчэ тады, калі верыла ў Дзеда Мароза.

Кніга насамрэч падарунак вельмі рызыкоўны. Што ўжо казаць пра кнігу на беларускай мове!

І ўсё ж рызыкну — паспрабую зрабіць спіс тых выданняў, якія могуць быць дачытанымі да канца самымі звычайнымі чытачамі.

Пачнем з паэзіі. Хоць яна і каралева літаратуры, але масавы чытач яе цярпець не можа. Шчаслівым выключэннем тут можа стаць кніга Усевалада Сцебуракі «Бег па самаадчуванні». Вершаваныя творы Сцебуракі па-добраму ўражваюць — яснасцю мовы, прамалінейнасцю думкі, традыцыйнасцю ў прыхільнасцях. Каханне, сяброўства, Радзіма — так, гэта па-ранейшаму кранае. Больш за тое — гэта кранае менавіта цяпер, на фоне татальнай «прасцёбленасці» беларускай паэзіі. Каму дарыць? Мамам, татам, любімым і дарагім. Калі вы рамантык з цвёрдай нацыянальнай пазіцыяй, які дбае пра ўласны гонар, — гэтая кніга для вас таксама!

А вось калі вы хочаце зрабіць падарунак вытанчанай жанчыне — падарыце ёй кнігу «Рыбы» Насты Кудасавай. Крытык Марына Весялуха таксама напісала пра гэтую кнігу дзіўна. «Калі паспрабаваць вывесці рэцэпт «Рыб», то атрымаецца прыкладна наступнае: да 100 грамаў міфалогіі дадаць 300 грамаў рэлігіі, 150 грамаў філасофіі, 20 крылаў анёлаў, 5 птушыных гнёздаў, 3 выраі, 2 чайныя лыжкі суіцыдальнасці. Сумесь заліць літрам настойкі кахання на абсэнце і глінтвейне (алкагольныя напоі змешваць у роўнай прапорцыі), дадаць жменю шчырасці, жменю адданасці, варыць цягам гадзіны на павольным агні. Гэтае чароўнае паэтычнае зелле рэкамендуецца прымаць падчас поўні, асабліва закаханым…» Ведаеце што? Я цалкам згодная з крытыкам! Гэты чароўны густы напой будзе да густу практычна любой жанчыне, але прыгожай — асабліва дарэчы.

Кнігу «Свамова» Ігара Кулікова, калі і дарыць, то ўпярэдзіўшы доўгай лекцыяй-тлумачэннем. Чытанне яго вершаў нагадвае разблытванне нітак старога пушыстага світара — быццам бы і нічога складанага, але як загрузнеш на якім слове, то, здаецца, і далей не можаш ісці, не парваўшы нітачку сэнсу. Але мяне, прызнацца, зачаравала моўная стыхія яго твораў, якія, бывае, гудзяць, як сцюдзёны вецер за акном: «… ува мне качуе кроў ардой нязнанай сілы,//і мысль не выславіць, што ныe ў касцях//я чую трымт сусвету што ломіцца мне ў жылы,//я на ігле надрыву, я ў прыступе жыцьця". Калі ў вас ёсць сябры з прэтэнзіяй на інтэлектуалізм, то можаце дарыць у якасці тэста. У любым выпадку будзе пра што пагаварыць пасля.

Відавочна з думкай пра тое, чым заняць уражлівага чытача, пісала свае «Ночы на Плябанскіх млынах» Людміла Рублеўская. Вось як пачынаецца сам твор: «Я не ведаю, чаму людзі так любяць страшныя гісторыі. Вядома, усе прагнуць цудаў. Без веры ў цуд душа сляпая, нібы начны матыль. Але вельмі часта ў пошуку незвычайнага мы ляцім, як тыя матылі, не да зор, а на агеньчык свечкі альбо газоўкі…» Асабіста я — не аматар формульнай літаратуры, усіх гэтых чылераў, якія халодзяць кроў. Мне больш даспадобы яе іранічныя, удала стылізаваныя «Старасвецкія міфы горада Б.», якія таксама ўвайшлі ў кнігу. Але калі ў вас ёсць сябры, якія любяць адначасова містыку і нацыянальную гісторыю, але ў версіі light, то кніга «Ночы на Плябанскіх млынах» у першую чаргу — для іх.

Выдатным падарункам для жанчын стане з густам аформленая кніга «Джульета і экстрасэнс» Таццяны Мушынскай. У кнізе некалькі твораў, напісаных у такім рэдкім жанры, як любоўны раман. Але асаблівую ўвагу заслугоўвае дакументальная аповесць «Сад маіх успамінаў» — проза настолькі густоўная, жаночая, лірычная, што яе нават няма з чым параўнаць. Прызнаюся, гэты твор чытаўся проста на адным дыханні, бо гэта той рэдкі выпадак, калі аўтар піша так, што ўзнікае адчуванне, што кожнае слова напісана для цябе і пра цябе. Калі вы маеце патрэбу ў мудрым, дасціпным суразмоўцы — гэтая кніга для вас.

Добрым і недарагім прэзентам стане чарговы томік казак Адама Глобуса. Цяпер гэта «Казкі пра дарослых». Здаецца, яго лепш дарыць мужчынам — не толькі з-за зместу, але і з-за фармату: кніжка невялікая і добра ўваходзіць у кішэню мужчынскай курткі ці пінжака. Яе можна чытаць у набітым людзьмі транспарце, на людным працы, на сумнай лекцыі. Адна праблема — казкі бываюць даволі вясёлыя, таму чытач раней ці пазней выдасць сябе гучным смехам. Карацей, кніга прыемная ва ўсіх адносінах.

Тыя ж перавагі і недахопы — вясёлы змест і малы памер — мае і дзіўна звярстаны «Блог Усяслава Чарадзея», напісаны, вядома ж, самім Усяславам Чарадзеем. Кнігу можна дарыць выключна людзям, чыё пачуццё гумару вы спраўдзілі на сабе. Філістар вам гэтай кнігі не даруе і будзе абмяркоўваць кожны эпізод да сканчэння часу, пераконваючы вас, што «цудам адшуканы дзённік князя-пярэваратня» — гэта падробка. Таму лепш за ўсё дарыць такую кнігу самому сабе — разумнаму, іранічнаму, дасведчанаму, здатнаму распазнаваць класічныя цытаты.

Каб не губляць чытацкай увагі, ад кніжак вясёлых, маленькіх і недарагіх пяройдзем да кніжак страшных, тоўстых і перакладных. Безумоўна, грунтоўным падарункам любімай цётухне ці маме будзе зборнік дэтэктыўных апавяданняў «Злачынства, сэр» і зборнік містыкі «Вусцішны пакой». Выдатны выбар — хай трохі адпачнуць ад серыялаў! А вось жанчынам маладзейшым варта прэзентаваць «Хараство жыцця» Міхаэля Кумпфмюлера — выдатная вытанчаная вокладка сама па сабе, без любоўнай гісторыі ўсярэдзіне, стварае ўзнёслую атмасферу свята. Зноў жа, вельмі пачуццёвы, поўны смутку і дзявочых надзей тэкст — выдатны напамін пра тое, што цаніць трэба сапраўдныя, а не ўяўныя каштоўнасці.

Як ні дзіўна, прасцей за ўсё абрадаваць сёлетняй кнігай будзе чалавека разумнага, адукаванага і патрыятычнага.

Асабліва тады, калі ён любіць гісторыю. Вельмі пашанцавала мінчанам, якія атрымалі тры цудоўныя кнігі пра любімы горад. Безумоўна, адной з найяскравейшых з'яў культуры стала кніга Леаніда Маракова «Галоўная вуліца Мінска. 1880–1940. Кніга 1». Кніга складаецца з дакументаў, фотаздымкаў, успамінаў, прысвечаных мінскаму праспекту Незалежнасці. Аўтар зрабіў тытанічную працу, якую чытачы ацанілі належным чынам: гавораць, што яна была літаральна змецена з прылаўкаў кнігарняў.

Мінску прысвечана і кніга «Творы» Лявона Савёнка (раю чытаць аповесць «Запіскі эмігранта» — выдатны мастацкі твор, унікальны тым, што спалучае, здавалася б, неспалучальнае — Мінск у часы апошняй вайны, дзённікавую форму і востра-сатырычны погляд фельетаніста). Не менш цікавы жыхарам нашай сталіцы — як старэйшага ўзросту, так і маладым — будзе «Дзённік 1943–1947» Дзмітрыя Сямёнава, які ламае многія стэрэатыпы, закладзеныя ў нашы галовы школьнымі падручнікамі.

«Смак Беларушчыны» Генадзя Кісялёва — зборнік артыкулаў, прысвечаных пераважна постацям і дакументам XIX стагоддзя, напісаны настолькі ярка і цікава, што я б з задавальненнем залічыла яго да мастацкай літаратуры. Як і кнігу «Лісты жыцця і кахання», якая прадстаўляе перапіску Гаўрылы і Ларысы Гарэцкіх. Эпісталярны помнік стаў сапраўдным гімнам каханню і дазваляе па-іншаму паглядзець на людзей старэйшага веку.

Ну і, безумоўна, самым арыгінальным кніжным падарункам стане прадукцыя электроннага выдавецтва BYBOOKS, якую можна проста спампаваць з інтэрнэту. Асабліва раю кнігу Маргарыты Аляшкевіч «Мадэль для забойства». Яе з задавальненнем прачытаюць усе беларускамоўныя дзяўчаты нашай краіны — свежае, актуальнае, іранічнае чытво.

Так выглядае, што не надта багаты на падзеі і адкрыцці 2013-ы кніжны год запомніцца як год відавочнага павароту да масавай літаратуры і актуалізацыі мінулага.

Ганна КІСЛІЦЫНА

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

16 СТУДЗЕНЯ 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15736)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Дзіма КАМІНСКІ:

«НЕПУНКТУАЛЬНЫ ІНТЭЛІГЕНТ БЕЗ СТЭРЭАТЫПАЎ»



Харызматычны, рамантычны і пазітыўны. Такім гэты артыст з'яўляецца на сцэне і ў жыцці. Сам жа ён называе сябе «непунктуальным інтэлігентам без стэрэатыпаў». Нехта памятае яго як яркага ўдзельніка ўкраінскай «Фабрыкі зорак», але, мабыць, у многіх імя Дзімы Камінскага асацыюецца з клубнай і танцавальнай музыкай, якую можна пачуць у тым ліку і на радыё. Восенню мінулага года Дзіма прэзентаваў свой першы сольны альбом «#Месяцаход8», дзе пануе бясконцасць пачуццяў, пазітыву і часам нават іроніі. Пры сустрэчы мы пагаварылі не толькі пра музыку, але і пра яе ўплыў на яго жыццё.

— Што можа расказаць пра цябе твой альбом «#Месяцаход8»?

— Што гэта чалавек, які пачаў жыць на пазітыве і цаніць многія рэчы. Яму проста захацелася паляцець на Месяц ад усіх тых, хто здольны зрабіць яму дрэнна. «#Месяцаход8» — такі касмічны антыдэпрэсант. Ён, на маю думку, дапамагае людзям паверыць у сябе, знайсці свой шлях. Быць на пазітыве і атрымліваць ад жыцця максімум. Маёй асноўнай задачай было зрабіць ухіл на жыццярадаснасць. Праўда, ёсць песні, дзе я іранізую над некаторымі момантамі жыцця. Напрыклад, я не адзін год працаваў у клубах і мне заўсёды было цікава назіраць за людзьмі, аналізаваць іх паводзіны. Наогул кожная кампазіцыя мае свой пасыл. Было б жаданне шукаць!

— Выходзіць, на стварэнне альбома натхнілі рэальныя падзеі з жыцця?

— Я веру, што музыка можа лячыць. Ствараючы музыку і паглыбляючыся ў працу над альбомам, спрабаваў настройвацца на сувязь з космасам. Апынуцца там, дзе ніхто мяне не бачыць, і я нікога не чую.

— А што гучыць у тваім асабістым плэй-лісце?

— Стараюся слухаць пераважна тую музыку, якая дорыць станоўчыя эмоцыі. Не люблю меланхолію. У нашым жыцці і так хапае адмоўнага. За свае гады я многае бачыў і зразумеў: чалавек сам сабе гаспадар, і пакуль ты жывеш, трэба несці іншым пазітыў, дапамагаць людзям.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Выклікае чырвоная планета

«ПЕРШАЕ СЛОВА НА МАРСЕ БУДЗЕ СКАЗАНА ПА-БЕЛАРУСКУ»

Быў час, калі савецкія хлопчыкі марылі стаць касманаўтамі, ледзь не ў кожнай кватэры стаяў цацачны месяцаход, а перамога ў гонцы касмічнай вытворчасці для дзяржаў лічылася справай гонару. А цяпер часам тых, хто хоча завяваць космас, называюць рамантыкамі і летуценнікамі. А таму і не дзіўна, што ў міжнародны праект «Mars One», які адбірае групу людзей, што мусяць першымі паляцець даследаваць чырвоную планету, многія не вераць і ставяцца да яго скептычна. Зусім іншага погляду прытрымліваецца беларускі праграміст Міхаіл РУМЯНЦАЎ. Ён, між іншым, прайшоў першы этап своеасаблівага кастынгу, у якім удзельнічалі 200 тысяч чалавек з усёй планеты, і верыць, што здолее паляцець на Марс!

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

20 долараў за мару

З Міхаілам мы сустрэліся ў той студзеньскі дзень, які сваёй плюсавой тэмпературай і надвор'ем больш нагадваў восень, а не зіму.

— А на Марсе сярэдняя тэмпература — мінус 50 градусаў, — заўважае Румянцаў. — На гэтай планеце ўсё залежыць ад рэльефу. Там слабая атмасфера і адсутнічаюць стабільныя прыродныя ўмовы.

Кругагляд хлопца сапраўды ўражвае. Здаецца, па сваёй тэме ён ведае ўсё. Міхаіл з дакладнасцю знаўцы кажа, што адлегласць ад Зямлі да Марса складае прыкладна 55 мільёнаў кіламетраў, аб'ём — 0,15 ад аб'ёму Зямлі, і менавіта на Марсе знаходзіцца гара Алімп (21200 м), самая высокая ў Сонечнай сістэме. Але адкуль такая інфармаванасць і зацікаўленасць космасам?

— Яшчэ ў дзяцінстве я захапляўся фізікай і на гэтай глебе зацікавіўся навуковай фантастыкай, — узгадвае наш суразмоўца. — Фантастычныя фільмы мяне не ўражвалі. Іншая справа — літаратура. Ужо з 6-га класа я пачаў чытаць Курта Ванегута, Рэя Брэдберы, Роберта Шэклі...

— У гэтым плане ты, напэўна, апярэджваў аднакласнікаў...

— Магчыма. Мой інтарэс праявіўся ў захапленні Сусветам, касманаўтыкай. Я шмат чытаў пра новыя касмічныя тэхналогіі. І калі даведаўся пра праект галандскага вынаходніка і прадпрымальніка Баса Лансдарпа «Mars One», адразу вырашыў запоўніць спецыяльную форму на сайце. Чаму менавіта Марс? Усё проста. Гэта планета чымсьці падобная да Зямлі. Праект адразу выклікаў рэзананс у заходніх і расійскіх сродках масавай інфармацыі. Яго мэта — развіццё і заснаванне чалавечай калоніі на Марсе. Дзеля гэтага трэба адабраць 24 добраахвотнікі, чатыры з якіх мусяць адправіцца на Марс у 2024 годзе. Палёт будзе працягвацца 210 дзён. Па афіцыйнай інфармацыі, да арганізатараў прыйшло каля 200 тысяч заявак з усіх кантынентаў. Што яны з сябе ўяўляюць? Вялікая анкета і відэаролік, якія павінны дапамагчы арганізатарам скласці псіхалагічны партрэт чалавека, зразумець, ці сапраўды ён зацікаўлены праектам. Акрамя таго, неабходна было зрабіць унёсак. Напэўна, дзеля таго, каб адразу выкрасліць з патэнцыйных удзельнікаў тых, хто ўспрымае «Mars One» як гульню ці жарт. Для беларусаў гэтая сума склала 20 долараў.

— Разам з 1057 удзельнікамі ты трапіў у другі раўнд адбору. Што чакае вас далей?

— Сур'ёзная медыцынская камісія і псіхалагічнае тэсціраванне. Ужо ў наступным годзе арганізатары павінны вызначыцца з тымі, каго трэба рыхтаваць да палёту.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ»)

РазМЕРКАВАННЕ

ПРАЦА «З АГЕНЬЧЫКАМ»

Яго прозвішча вельмі сугучнае з прыгожым беларускім словам «мара». Юрый Марук, начальнік караўла пажарнай аварыйна-выратавальнай часці № 3 г. Мінска, сапраўды з самага дзяцінства марыў пра адну рэч — быць пажарным. Гэтак жа, як яго бацька і дзед. Задуманае здзейснілася, і сёння малады спецыяліст мае ў падначаленні падраздзяленне з 15 чалавек. Што адчуваеш, калі ўпершыню патушыш пажар, чаму за выратаванае жыццё амаль ніколі не дзякуюць і да якога «экстрыму» павінны быць гатовыя нявесты выратавальнікаў, Юрый Марук распавёў нашым карэспандэнтам.

Замест цацак — брандспойт

— Я нарадзіўся і вырас у Баранавічах, — гаворыць хлопец. — Дзякуючы дзеду і бацьку зведваць «сакрэты прафесіі» пачаў, лічы, з дзяцінства. Здаралася, мама прыводзіла мяне ў пажарную часць, калі ішла па справах і не мела з кім пакінуць. Але я быў не супраць. Усё, што там бачыў, здавалася цікавым і прыцягальным, — кажа Юрый.

Пасля, ужо ў падлеткавым узросце, Юрый стаў займацца пажарным спортам і далучыўся да Беларускай моладзевай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных. Здавалася б, далейшы шлях цалкам лагічны — прадоўжыць справу дзеда і бацькі, але, на дзіва, родныя былі супраць.

— Мама вельмі не хацела, каб ішоў у гэтую прафесію. Тым больш я адзінае дзіця, — распавядае Юрый. — Нават бацька быў супраць майго выбару. Ён як ніхто ведаў, наколькі бывае часам нялёгка ў гэтай прафесіі, але я для сябе на той момант ужо ўсё вырашыў.

У выніку ў 2007 годзе Юрый паступіў у Мінскі камандна-інжынерны інстытут. Навучанне там доўжыцца чатыры гады, але лад жыцця ў гэтым інстытуце нашмат адрозніваецца ад таго, з чым сутыкаюцца студэнты іншых ВНУ. Па-першае, навучэнцы-бюджэтнікі тут называюцца не студэнтамі, а курсантамі, і дзеляцца не на групы і патокі, а на ўзводы і аддзяленні. Па-другое, час навучання ім залічваецца як служба ў арміі. Першы курс падрыхтоўкі праходзіць не ў сталіцы, а за трыццаць кіламетраў ад яе, у пасёлку Юхнаўка. Расклад — не для «слабакоў». Хлопец, які толькі нядаўна еў маміны аладкі на сняданак, сутыкаецца са штодзённым пад'ёмам па камандзе ў 6.30 раніцы.

Пасля вячэры даецца ўсяго гадзіна на асабістыя справы, а магчымасць схадзіць у звальненне, пра якую ўсе вельмі мараць, можа «не здарыцца» з-за самага дробнага парушэння дысцыпліны.

— Галоўны мой успамін пра першы курс — гэта, відаць, пастаяннае жаданне паесці, — смяецца Юрый. — Фізічная нагрузка вельмі вялікая, многія хлопцы з-за гэтага худзеюць. Яшчэ надта хочацца спаць. Да інстытута я нават і не ўяўляў, як можна сядзець на занятках і міжволі літаральна падаць на парту.

Юрый кажа, што рытм вытрымліваюць не ўсе. Застаюцца ў асноўным тыя, хто зрабіў свой выбар свядома.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Фота Надзеі БУЖАН.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
16 01 2014 г.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На вагу «золата»

«ПАЛЯВАННЕ» НА АБІТУРЫЕНТАЎ

Будучых студэнтаў шукаюць паўсюль. Нават у віртуальнай прасторы

Падчас апошняй прыёмнай кампаніі шэраг беларускіх ВНУ ўпершыню сутыкнуліся з сур'ёзнымі праблемамі з запаўненнем месцаў. Але зусім не таму, што ўчарашнія школьнікі раптам перасталі марыць пра вышэйшую адукацыю і нацэліліся на атрыманне рабочай прафесіі. Проста колькасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ працягвае змяншацца з года ў год, а тут яшчэ і Міністэрства адукацыі павысіла патрабаванні да прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

Вынік не прымусіў сабе чакаць — незапоўненымі ў ВНУ засталіся 2,4 тысячы бюджэтных месцаў, што ў пяць разоў перавышае паказчык папярэдняга года. Цалкам план прыёму выканалі толькі 16 дзяржаўных ВНУ з 45.

І толькі дзвюм ВНУ — Гродзенскаму і Віцебскаму дзяржаўным універсітэтам — удалося не проста выканаць план, але і ўкамплектаваць цалкам нават педагагічныя спецыяльнасці фізіка-матэматычнага профілю. Для даведкі: з 296 незапоўненых бюджэтных месцаў на педагагічных спецыяльнасцях па ўсёй краіне 184 былі звязаны менавіта з фізікай і матэматыкай...

Выбірайце нас!

— Не думайце, што мы ўвогуле не сутыкаемся з цяжкасцямі ў працэсе прыёмнай кампаніі, — кажа **першы прарэктар Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Васіль МАЛІНОЎСКІ.** — І дэмаграфічная сітуацыя — толькі адна з акалічнасцяў, з якой мы вымушаны лічыцца. Не сакрэт, што сучасная моладзь зарыентаваная на «модныя» эканамічныя і юрыдычныя спецыяльнасці. А наш універсітэт рыхтуе пераважна педагагічныя і навукова-педагагічныя кадры. Да таго ж практычна па ўсіх спецыяльнасцях мы маем сур'ёзных канкурэнтаў. Прычым не толькі ў нашым рэгіёне... Зусім побач з Віцебскам — Смаленская вобласць і расійскія ВНУ, таму пагроза адтоку абітурыентаў у суседнюю краіну вельмі высокая...

Для выяўлення прафесійных намераў выпускнікоў школ універсітэт штогод праводзіць анкетаванне. Па яго выніках фарміруецца электронная база «Абітурыент ВДУ». Летась у анкетаванні ўдзельнічала прыкладна 5 тысяч чалавек (каля 70% ад агульнай колькасці выпускнікоў Віцебскай вобласці), восенню 2013 — каля 6 тысяч чалавек. У выніку ўжо ў снежні кіраўніцтва ўніверсітэта валодала вельмі каштоўнымі звесткамі. Па-першае, пра абітурыентаў, якія мэтанакіравана збіраюцца паступаць у ВДУ. Па-другое, пра абітурыентаў, якія яшчэ не вызначыліся са сваім выбарам, але згадваюць Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт у ліку прыярытэтаў, а таксама пра абітурыентаў, якія плануюць паступаць у іншыя ВНУ, але патэнцыяльна (па наборы дысцыплін, якія маладыя людзі плануюць здаваць на ЦТ) яны падыходзяць і для Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

— Наша задача — першых не страціць, а тых, хто вагаецца, пераканаць, што наш універсітэт — найлепшы выбар з магчымых. І, нарэшце, абавязкова паспрабаваць пагутарыць з тымі, хто мае намер паступаць у іншыя ўстановы за межамі вобласці і Беларусі, бо нярэдка падобны выбар прадыктаваны не столькі жаданнем навучацца ў канкрэтным універсітэце, колькі ілюзіяй будучай самастойнасці і незалежнасці ад апекі бацькоў, — падкрэслівае Васіль Маліноўскі.

«ВКонтакте» з кожным

У Віцебскім дзяржаўным універсітэце пераканаліся, што ў прафарыентацыйнай рабоце дробязяў не бывае, і нават нязначная на першы погляд дэталь можа паўплываць на прафесійныя намеры абітурыента. Масавая рэклама ў школах пачынаецца яшчэ ў 10-м класе, калі старшакласнікі толькі вызначаюцца з наборам дысцыплін на ЦТ.

Увогуле ж для прафарыентацыйнай работы вылучаны тры галоўныя мэтавыя групы. Для інфармавання бацькоў размяшаецца рэклама ў СМІ, работнікі ўніверсітэта наведваюць бацькоўскія сходы ў школах. З настаўнікамі яны сустракаюцца ў рамках дзейнасці вучэбна-навуковых кансультацыйных цэнтраў. Таксама педагогаў запрашаюць на семінары. Яшчэ адзін важны канал інфармавання — часопіс «Сучасная адукацыя Віцебшчыны», які ўніверсітэт пачаў выдаваць разам з упраўленнем адукацыі Віцебскага аблвыканкама.

Што да работы з выпускнікамі, то тут галоўны акцэнт зроблены на яе адраснасць і індывідуальнае суправаджэнне патэнцыяльных абітурыентаў. Гэта і рассылка рэкламных лістоў, і індывідуальныя запрашэнні на дзень адчыненых дзвярэй, і адрасныя запрашэнні на ўніверсітэцкія алімпіяды і конкурсы, прыцягненне да ўдзелу ў навукова-даследчай рабоце, аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы да ЦТ, наладжванне асабістых кантактаў для прадастаўлення неабходнай інфармацыі.

Ва ўніверсітэце, напрыклад, дзейнічаюць вочна-завочная школа «Беларуская філалогія», інтэрнэт-курсы па прадметах уступных выпрабаванняў, праводзяцца вэбінары па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання, дыстанцыйныя майстар-класы выкладчыкаў універсітэта і іншае. Увогуле работа ў віртуальнай прасторы — гэта найбольш дзейсны канал інфармавання моладзевай аўдыторыі.

Статыстыка сведчыць, што да 2016 года колькасць выпускнікоў базавай і агульнаадукацыйнай школ у суме будзе нязменнай — на ўзроўні 145 тысяч чалавек. Тэндэнцыя змяншэння колькасці выпускнікоў агульнаадукацыйнай школы захаваецца да 2015 года.

Такая ж напружаная дэмаграфічная сітуацыя сёння склалася і ў суседніх краінах — Літве, Расіі, Украіне і Польшчы, якія таксама зацікаўлены ў прыцягненні абітурыентаў з Беларусі. У Польшчы, напрыклад, колькасць абітурыентаў за апошнія гады зменшылася на 40%.

Улічваючы папулярнасць сярод моладзі сацыяльных сетак, **вясной 2013 года ў сетцы «ВКонтакте» была створана суполка «Абітурыент ВДУ»** з размяшчэннем там электронных рэкламных буклетаў, прэзентацый і відэаролікаў факультэтаў. Суполка выкарыстоўваецца таксама для аператыўнага інфармавання і адказаў на пытанні абітурыентаў. Як вынік — у перыяд прыёмнай кампаніі фіксавалася ад 50 да 100 праглядаў штодзень з геаграфіяй наведнікаў ад Беларусі і Расійскай Федэрацыі да Германіі і ЗША.

А вас мы папросім... застацца

А найскладанейшы этап прыёмнай кампаніі пачынаецца летам, калі значэнне мае літаральна ўсё: афармленне рэкламных і інфармацыйных стэндаў, віртуальнае суправаджэнне, магчымасць адсочваць прыём дакументаў у рэжыме анлайн, бездакорная работа прыёмнай камісіі, яе добрае тэхнічнае забеспячэнне.

Падачу дакументаў асабіста кантралююць дэканы факультэта: на пасяджэннях прыёмнай камісіі яны штодзень робяць справаздачу. І вось тут база «Абітурыент ВДУ» вельмі дапамагае: члены прыёмнай камісіі адсочваюць, колькі абітурыентаў ужо падалі заявы, колькі прыедуць у бліжэйшыя дні і чаму хтосьці з маладых людзей раптам перадумаў.

— Дарэчы, падаць дакументы абітурыент можа без цяжкасцяў. А вось перш чым іх забраць... яму давядзецца пагутарыць асабіста з дэканам факультэта, каб мы маглі пераканацца, што рашэнне было прынята не пад уплывам эмацыянальнага парыву, а рацыянальна і свядома. У большасці выпадкаў пасля такой размовы жаданне некуды ўцячы знікае, — прыадкрывае сакрэты паспяховай работы з абітурыентамі Васіль Маліноўскі. — Станоўчы вынік даюць і агульныя конкурсы па факультэтах — у абітурыентаў няма падстаў нервавацца да апошняй хвіліны. Прыярытэты расстаўлены, і залічэнне на адну са спецыяльнасцяў — фактычна вырашаная справа. У сваю чаргу сакратарыятам прыёмнай камісіі ствараюцца ўсе ўмовы для таго, каб абітурыенты ў сценах універсітэта адчувалі сябе па-сапраўднаму камфортна і захацелі застацца тут яшчэ на некалькі гадоў.

І ўсё ж, нягледзячы на ўсе поспехі, у Віцебскім дзяржаўным універсітэце пераканаліся, што няма такіх спецыяльнасцяў, на якія загадзя гарантаваны 100-працэнтны набор. І нават калі сёлета ўсё складваецца выдатна, зусім не факт, што і праз год усё пройдзе гладка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Рэпетыцыя» іспытаў

КАБ ВЫНІКІ ЦТ НЕ СТАЛІ НЕПРЫЕМНЫМ СЮРПРЫЗАМ...

У студзені ў краіне стартаваў другі этап рэпетыцыйнага тэсціравання, які будзе доўжыцца да канца лютага. Для абітурыентаў такое тэсціраванне — унікальная магчымасць высветліць, якія прабелы існуюць у іх ведах і на якіх раздзелах школьнай праграмы трэба сканцэнтраваць сваю ўвагу.

— Упэўнены, што заняткі з рэпетытарам ніколі не дадуць такой багатай інфармацыі для роздуму, як вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання. Для некаторых выпускнікоў і іх бацькоў яго вынікі становяцца громам сярод яснага неба, асабліва калі тыя маюць у школе высокія адзнакі, якія не пацвярджаюцца высокімі баламі на рэпетыцыйным тэсціраванні, — падкрэслівае **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**, і папярэджвае, — абітурыенты памыляюцца, думаючы, што можна якасна падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання за паўгода ці год, муштруючы тэсты. На жаль, такой думкі прытрымліваюцца і некаторыя настаўнікі. Фрагментарныя веды вучняў сведчаць аб адсутнасці ў некаторых установах адукацыі сістэмы ў навучальным працэсе. Вывучаць матэматыку, фізіку, біялогію і іншыя школьныя дысцыпліны па тэстах — заганная практыка.

Заданні ў тэстах хоць і адпавядаюць школьнай праграме, але самі тэсты не перадаюць усёй паслядоўнасці таго ці іншага курса. Трэба на занятках выконваць патрабаванні вучэбных праграм. Калі выпускнік школы ведае, як рашаць задачы па ўсіх раздзелах курса, то поспех на ўступных іспытах яму забяспечаны. А тэст — гэта найперш сродак дыягностыкі. Вядома, абітурыенты павінны мець навык работы з тэстамі, але тут маецца на ўвазе тэхналогія запаўнення бланкаў, псіхалагічная падрыхтоўка, уменне разлічыць час на выкананне тэставых заданняў.

— Мы настойваем на тым, каб арганізатары «рэпетыцыі» прытрымліваліся ўсіх правіл правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення экзамену: ніякіх мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі быць не павінна! Арганізатарам дазваляецца кансультаваць удзельнікаў «рэпетыцыі» толькі па тэхналогіі работы над тэстам і па парадку запаўнення бланка. Кансультацыі па змесце тэстаў не дапускаюцца, — кажа Мікалай Фяськоў.

Традыцыйна на кожны з этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання выносяцца некалькі варыянтаў тэстаў па кожным прадмеце. Калі абітурыент пажадае ўдзельнічаць у рэпетыцыйным тэсціраванні другі раз, трэба будзе папярэдне праінфармаваць адказнага арганізатара аб тым, што ён ужо выконваў, напрыклад, першы варыянт тэста. Колькасць дысцыплін, якія можна здаваць на рэпетыцыйным тэсціраванні, у адрозненне ад ЦТ, ніхто не абмяжоўвае. Таксама да ўдзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні дапускаюцца і дзесяцікласнікі.

Для павышэння эфектыўнасці ад удзелу ў рэпетыцыі ЦТ можна скарыстацца паслугамі рэгіянальнага цэнтра тэсціравання і прафесійнай арыентацыі моладзі пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, які ўжо не першы год арганізуе пры падтрымцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў індывідуальныя кансультацыі для ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання. Там могуць пракансультаваць любога абітурыента, незалежна ад пункта праходжання тэсціравання і месца яго жыхарства. Мэта такой кансультацыі — ліквідацыя прабелаў у ведах і далейшая падрыхтоўка па тэматыцы тэставых заданняў, з якімі абітурыенты не справіліся на «рэпетыцыі» экзамену. Індывідуальная кансультацыя ўяўляе сабой рассылку вучэбна-метадычнага пакета, які змяшчае тэматыку раздзелаў школьнай праграмы па кожным няправільна выкананым заданні з указаннем года ці класа вывучэння адпаведнага раздзела, з рэкамендаваным спісам вучэбнай і метадычнай літаратуры, са зместам няправільна выкананых заданняў, правільнымі адказамі і ўказаннем да правільнага рашэння. Кансультацыйныя паслугі аказваюць удзельнікам рэпетыцыйнага тэсціравання таксама ў Ліцэі БДУ.

Між іншым, арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання заўважылі, што на вынік выканання таго ці іншага тэставага задання аказвае ўплыў навізна матэрыялу для ўдзельнікаў іспытаў. Абітурыенты дапускаюць больш памылак у заданнях, якія не ўключаліся ў папярэднія гады. І наадварот. Так, некалькі гадоў запар у тэставых заданнях па рускай мове прапануюцца сказы, дзе працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам пры наяўнасці дзеяслова-звязкі не ставіцца (Мудрость есть ум, соединенный с добротой). Вынік — кожны раз каля 30% абітурыентаў дапускаюць памылкі. Калі ж па беларускай мове ў тэстах на гэтае правіла прапанавалі заданне з перапынкам у два гады, колькасць памылковых адказаў падвоілася.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Будзь у курсе:

Для ўдзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні абітурыент павінен зарэгістравацца ў адным з пунктаў яго правядзення (пералік можна знайсці на сайце www.rikc.by).

Для рэгістрацыі абітурыенту трэба мець пры сабе:

✓дакумент, які сведчыць яго асобу (пашпарт, від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь або пасведчанне бежанца);

✓квітанцыю аб унясенні платы за ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні (кошт складае 41 800 рублёў).

На новым месцы

РАЗГЛЕДЗЕЦЬ ПЕРСПЕКТЫВУ

СПРАБУЕ МАЛАДАЯ ЎРАЧ-АФТАЛЬМОЛАГ З ГЛЫБІНКІ

Мікашэвічы вядомыя ў першую чаргу дзякуючы дзяржаўнаму прадпрыемству «Граніт» і, напэўна, аднайменнаму футбольнаму клубу. У горадзе жыве 18 тысяч чалавек, ды і горадам Мікашэвічы сталі зусім нядаўна — у 2005 годзе. Кацярына ЛУКАШЭВІЧ апынулася тут пяць месяцаў таму — 24-гадовы хірург прыехала ў глыбінку па размеркаванні.

Мікашэвіцкая бальніца знаходзіцца на самым ускрайку горада, у сасновым бары. Гэта даволі вялікі для населенага пункта, які не з'яўляецца райцэнтрам, будынак. На другім паверсе — кабінет афтальмолага. Кацярына Лукашэвіч працуе тут разам з медсястрой Анжэлай НАГОРНАЙ.

— Я родам са Століна, — кажа Кацярына. — Калі перада мной паўстала пытанне, кім быць, доўга не думала. Старэйшая сястра — медык, вось я і вырашыла пайсці па яе слядах.

У 2012 годзе Кацярына скончыла Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт па спецыяльнасці «ўрач-хірург». Дзяўчыну размеркавалі ў Лунінец, але пакуль яна праходзіла інтэрнатуру ў Брэсце, патрэба ў маладым спецыялісце ў Лунінецкай бальніцы адпала.

Другім сюрпрызам для Кацярыны стала яе спецыялізацыя — афтальмолаг.

— Да мяне тут гадоў 15 акулістам працавала жанчына. Яна разам з мужам-доктарам пераехала жыць і працаваць у Мінск, вось і знайшлося месца для мяне. Вялікіх праблем з адаптацыяй да новага віду дзейнасці не было, бо інтэрнатуру я таксама праходзіла ў аддзеле мікрахірургіі вока Брэсцкай абласной бальніцы. Спачатку жартавала з пацыентамі, якія занадта моцна хвалявaліся на прыёме: «Чаго вы перажываеце? Вочы — парны орган, нават калі адно сапсуецца, другое ж застанецца!»

Умовы маладому спецыялісту былі прапанаваны не самыя дрэнныя — службовая кватэра («у трох кіламетрах ад бальніцы, каб фігуру падтрымліваць», — жартуе Кацярына) і заробак у 3,5 мільёна рублёў. З улікам начных дзяжурстваў, якія выпадаюць прыкладна раз на тыдзень, зарплата трохі павялічваецца. Па словах Кацярыны, гэта даволі высокі паказчык у параўнанні з аднакурснікамі, якія таксама працуюць у рэгіянальных бальніцах. Грошы грашыма, але як пачуваецца дзяўчына на новым месцы?

— Шчыра скажу: першае, што набыла ў Мікашэвічах — каляндар і маркер, — прыгадвае яна. — У жніўні і верасні закрэслівала кожны дзень і лічыла, колькі засталося да канца гэтых двух гадоў. Але потым... звыкаешся. Калі кожны дзень з задавальненнем працуеш, перастаеш заўважаць, як час ляціць. Вось ужо і маркер стаў не патрэбен. Акрамя таго, знаёмішся з добрымі людзьмі. Многія калегі, і ў прыватнасці Анжэла Міхайлаўна, дапамаглі адчуць сябе як дома.

Што датычыцца менавіта працы, то на думку Кацярыны, яе тут шмат. І гэта нягледзячы на тое, што ў райцэнтры — Лунінцы — працуе яшчэ большая бальніца. Атрымліваецца, што прыкладна палова раёна ездзіць у Лунінец, астатнія — у Мікашэвічы.

— Працаваць, шчыра кажучы, бывае цяжкавата, — распавядае Кацярына. — У мяне змешаны прыём: ходзяць і дзеці, і дарослыя. Усяго мы абслугоўваем прыкладна 20 тысяч жыхароў. За дзень да мяне прыходзіць мінімум 70-80 чалавек. Вельмі шмат запушчаных выпадкаў, асабліва ў людзей з вёсак, якія не прывыклі турбаваць кагосьці з-за такой, як ім здаецца, драбязы, як зрок. Задавальненне ад працы, безумоўна, ёсць, але хочацца больш працаваць рукамі. Тут жа ўмовы не дазваляюць праводзіць складаныя аперацыі. Самае сур'ёзнае з таго, чым я займаюся — выцягваю іншародныя целы з вачэй і выдаляю новаўтварэнні накшталт папілом. Дарэчы, нядаўна нам далі новую апаратуру, таму працаваць прыемна. Калі патрэбна парада ў нейкіх складаных выпадках — тэлефаную ў Лунінец, там мне дапамагаюць. Мае асноўныя пацыенты, зразумела, пенсіянеры. Многія даўно ўжо ведаюць, якія ў іх хваробы і як гэта лечыцца, а ў бальніцы, здараецца, спрабуюць кампенсаваць недахоп у зносінах. Прасцей кажучы, прыходзяць пагаварыць. Усе адразу ж заўважылі, што з'явіўся новы доктар, пачалі прыходзіць, цікавіцца...

— Некаторыя нават спрабавалі замуж выдаць, — смяецца Анжэла Міхайлаўна.

Ці складана маладому супрацоўніку ўліцца ў калектыў? Кацярына лічыць, што не.

— У нас працуе 300 чалавек, — кажа калега дзяўчыны. — Але большасць ужо пенсійнага ўзросту. Таму пра сяброўства размова не ідзе. Звычайныя працоўныя адносіны.

— Канфліктаў з калегамі не бывае, — працягвае Кацярына, — здараюцца непаразуменні з кіраўніцтвам. Напрыклад, калі хутка працую і пад кабінетам няма чаргі, кажуць, што трэба выдаваць больш талонаў. Быццам бы чэргі — гэта сведчанне правільна арганізаванага рэжыму працы.

Размаўляем з Кацярынай пра адпачынак. Дзяўчына кажа, што звычайна на яго проста не застаецца часу, асабліва калі даводзіцца дзяжурыць. У Мікашэвічах ёсць трэнажорны зал, більярдны і ігральны клубы, а таксама басейн, які цяпер на рэканструкцыі. Але галоўнае, што займае вольны час, — аўташкола.

Многія даўно ўжо ведаюць, якія ў іх хваробы і як гэта лечыцца, а ў бальніцы, здараецца, спрабуюць кампенсаваць недахоп у зносінах. Прасцей кажучы, прыходзяць пагаварыць.

— Я даўно хачу атрымаць вадзіцельскае пасведчанне, цяпер ёсць трохі часу, каб з гэтым разабрацца. Машыны, праўда, пакуль няма... А адпачываць з сябрамі я звычайна езджу ў Мінск, Брэст ці Гомель. Але здараецца такое нячаста. Бывае, сябры прыязджаюць у Мікашэвічы мяне праведаць. Калі-нікалі можам з іншымі маладымі калегамі схадзіць у мясцовую кавярню. Але з разнастайнасцю адпачынку тут, шчыра кажучы, цяжкавата, — гаворыць Каця.

Заставацца ў Мікашэвічах пасля адпрацоўкі яна пакуль не збіраецца — марыць аб працы хірурга, аб складаных аперацыях...

— Але я не шкадую, што апынулася тут. Насамрэч усё не так дрэнна, як можа здацца. Ад працы атрымліваю задавальненне, нават калі здараюцца праблемы, бо мне падабаецца дапамагаць людзям.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. Фота аўтара.
Мінск — Мікашэвічы — Мінск.

ПРАЦА «З АГЕНЬЧЫКАМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

А вось размеркаванне тут праходзіць, як і ў іншых, цывільных ВНУ. Тыя, хто першымі маюць права выбраць сабе месца службы, вызначаюцца з дапамогай сярэдняга бала.

— Наша спецыяльнасць называецца «Інжынер па папярэджванні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый», але кагосьці адпраўляюць «у службу» — тушыць пажары і ратаваць людзей, а кагосьці — у інспекцыю. Гэта значыць, што галоўным тваім абавязкам у такім выпадку становіцца назіранне за выкананнем нормаў пажарнай бяспекі на прадпрыемствах і іншых аб'ектах, правядзенне прафілактычных гутарак, расследаванне прычын пажараў.

Так атрымалася, што спачатку Юрый пачаў працаваць менавіта інспектарам. Паўгода ён правёў у Івацэвічах.

— Быць інспектарам — не для мяне. Бо гэта шмат у чым папяровая работа, — прызнаецца Юрый. — Я заўжды марыў пайсці менавіта «ў службу».

Справа, да якой ён так імкнуўся, хутка знайшлася. Юрый даведаўся, што ў Мінску ёсць падыходзячае месца. Хлопец перавёўся ў сталіцу.

На пажары эмоцыям не месца

Цяпер за плячыма Юрыя ўжо нямала самых розных надзвычайных сітуацый, але пра першае дзяжурства нельга не прыгадаць. З другога курса будучых пажарных рэгулярна адпраўляюць у вучэбную пажарную часць у якасці стажораў. Дзесьці чатыры разы на месяц даводзіцца заступаць на дзяжурства.

— Нават выратавальнікі, што працуюць шмат гадоў, свае першыя выезды памятаюць добра, — распавядае Юрый.— У маё першае дзяжурства да васьмі гадзін вечара ўсё было спакойна, а пасля паведамілі пра пажар на вуліцы Сацыялістычнай. Там у падвале старой царквы загарэліся дошкі. У хуткім часе мы вярнуліся, а тут і другі выезд не прымусіў сябе чакаць. На гэты раз выпадак быў больш сур'ёзным. Здарылася ўзгаранне ў цеплатрасе. Усяму віной — бяздомныя, што знайшлі там сабе прытулак. Як гэта заведзена, выпілі, закурылі, а ў выніку — аднаго з іх так і не ўдалося выратаваць з агню. Трэці пажар здарыўся ў Чыжоўцы. Гарэла кватэра, але, на шчасце, ніхто не пацярпеў.

Што ж адчувае малады пажарны, які ўпершыню сутыкаецца не проста з агнём, а яшчэ і са смерцю?

— Калі знаходзішся на пажары, не адчуваеш ніякіх эмоцый, — здзівіў сваім адказам Юрый. — У мяне было заўжды такое разуменне: мы не старонняя назіральнікі і не проста спагадлівыя людзі. Калі мы не зробім усё неабходнае, гэтага не зробіць ніхто.

Такое стаўленне, відаць, дапамагае не засяроджваць увагу на смерці, раненнях ці траўмах людзей, якіх ратуеш. Эмоцыі могуць «дагнаць» пазней, калі прыходзіш дадому і ўзгадваеш усё, што здарылася, але на працы трэба быць стрыманым.

— Першым часам, зразумела, сядзіш і нервова чакаеш выкліку. Ён здараецца — ты пачынаеш мітусіцца, — успамінае Юрый. — А спрактыкаваныя калегі робяць усё спакойна, няспешна. Па затратах часу атрымліваецца аднолькава, а лішнія нервы не псуюцца.

Такое стаўленне вельмі дапамагае і ў жыцці. Вось, напрыклад, «падрэзалі» цябе на дарозе, і ты ўжо не станеш крычаць і праклінаць увесь свет, а па прафесійнай звычцы пачнеш спакойна разбірацца ў сітуацыі. Бо калі чалавек ледзь не кожны дзень бачыць гора іншых, многія жыццёвыя праблемы пачынаюць здавацца яму драбязой. Зразумела, не ўсім уласцівы самакантроль. Калі выратавальнік разумее, што яму цяжка сябе перамагчы, ён не застаецца ў гэтай службе.

Гэтая справа — для «фанатаў»

Юрый Марук пасля атрымання дыплома працуе ўжо два з паловай гады, але да заканчэння абавязковага тэрміну адпрацоўкі яшчэ доўга. Для яго спецыяльнасці гэта не два, а пяць гадоў.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Такі тэрмін адпрацоўкі, па-мойму, справядлівы. Бо мы ж знаходзімся на поўным утрыманні дзяржавы, калі вучымся, — разважае Юрый.

Яго графік — суткі праз двое. Як начальнік каравула, на выкліках Юрый кіруе ўсім ходам дзеянняў, а ў часці праводзіць рэгулярнае навучанне. Трэніроўкі і заняткі абавязковыя нават для вопытных выратавальнікаў.

Юрый атрымлівае 5,2 мільёна рублёў у месяц. Праўда, падпрацоўваць у вольныя дні ніхто не забараняе.

Што датычыць забеспячэння жыллём, то ў выратавальнікаў ёсць некалькі пераваг. Юрый сёння жыве на здымнай кватэры. На працы яму даюць кампенсацыю, крыху большую за мільён рублёў. А ў хуткім часе ён зможа ўзяць 5-працэнтны крэдыт на будаўніцтва ўласнай кватэры.

Яшчэ выратавальнікі — людзі вельмі згуртаваныя і дружныя. Юрый расказаў пра цікавую традыцыю: калі нехта з калег жэніцца, маладыя абавязкова прыязджаюць у пажарную часць, дзе іх сустракаюць «аркай» з распыленай вады, а ў знак асаблівай павагі пару ставяць на пляцоўку высачэзнай, больш чым 50-метровай, лесвіцы, і падымаюць угору. Таму не баяцца вышыні павінны не толькі пажарныя, але і іх будучыя жонкі.

Толькі вось гэтая сітуацыя — не першая і не апошняя, калі ім даводзіцца панервавацца. Бо іх каханыя рызыкуюць жыццём кожны дзень. І дзіўна, што часам нават не чуюць слоў удзячнасці ад тых, каго ратуюць.

Што ж тады трымае на такой небяспечнай працы?

— Большасць маіх калег — гэта «фанаты» сваёй справы. А ў нашай прафесіі па-іншаму нельга, — лічыць Юрый.

Ён кажа, што пажарная часць — гэта зусім не тое месца, куды ідзеш дзеля вялікага заробку. І калі, разумеючы гэта, ты ўсё ж сюды прыйшоў і ўсім сэрцам застаешся верным сваёй справе, значыць, прафесійны выбар зроблены правільна.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
16 01 2014 г.

Па-за стэрэатыпамі

ІВАНАВЫ «СКАРБЫ», або ТАЛЕНТ БАЧЫЦЬ НЕЗАЎВАЖНАЕ

Уваходжу ў выставачную залу музея Заіра Азгура, і тут жа да мяне блізка-блізка падыходзіць хударлявы малады чалавек у акулярах і без усялякіх цырымоній пачынае мерацца са мной ростам. «Вось які я высокі!» — кажа на дзве галавы вышэйшы за мяне Іван. Яму 19 гадоў, і ён не развітваецца з фотаапаратам. Аб'ектыў — гэта тое, што дапамагае яму знаходзіць кантакт з соцыумам, такі нялёгкі для аўтыстаў.

«Калі б я мог застацца адзін...»

Сёння для Івана Шаўцова асаблівы дзень: адкрыццё персанальнай фотавыставы, якая перарасла ў цэлы арт-праект. У яго работах — тое, што атачае нас штодня, але чаго большасць з нас не заўважае ў штодзённай мітусні: ці то апошні прамень заходзячага сонца, ці то апалы восеньскі ліст, разам з якім адыходзіць цеплыня лета... Яркія колеры, дакладная кампазіцыя, трапныя дамінанты, зразумелыя ўсім сюжэты — такое чыстае светаўспрыманне западае ў душу кожнаму, хто бачыць Іванавы здымкі.

«Фатаграфія — гэта захапленне, у якім я імкнуся абстрагавацца ад дрэннага надвор'я за акном, паказаць гараджанам прыгажосць навакольнай прыроды, якую яны не могуць бачыць, таму што жывуць у хуткім тэмпе і не паспяваюць усё гэта заўважаць». Гэта адна з ранейшых Ваніных цытат, у якой увесь настрой яго здымкаў і ўвесь яго характар. І, пэўна, яшчэ ў гэтым: «Калі б я мог застацца адзін у цэлым Мультысусвеце на 10 трыльёнаў 526 мільярдаў 424 мільёны 657 тысяч 862 гады, то я б увесь гэты час слухаў музыку».

«Ваня навучыў мяне многім рэчам, у тым ліку праяўляць эмоцыі: хочаш узяць кагосьці за руку — бярэш. Хочаш запытаць нешта — пытаеш».

...Пакуль афарміцелі выставы дадаюць апошнія дэталі для завершанасці яе выгляду, Іван паказвае мне свае любімыя рэчы, якія дастае з вялікай кардоннай каробкі. Невялікі глобус, белая фуражка, насценны гадзіннік у выглядзе штурвала, мадэлі парускікаў... «Гэта мне сваяк з Кубы прывёз, — дэманструе Ваня парускік, што знаходзіцца ў празрыстым футарале. — Калі ён з Кубы, то і каробку можна было б у форме куба зрабіць. А гэтую мадэль я сам змайстраваў з канструктара».

Іван любіць мора і вандроўкі і, кранаючы маю руку, распавядае пра свае паездкі ў Санкт-Пецярбург, падарожжы па Крыме і спускі ў пячоры. Акрамя караблёў, сярод Іванавых «скарбаў» — шматлікія атласы і кнігі пераважна на марскую тэматыку. У атласе хлопец паказвае мне карту Беларусі і звяртае ўвагу: «Усе назвы па-руску напісаны, і толькі Мазыр па-беларуску. У мяне там бабуля».



Падчас размовы я разумею, што Іван сапраўды вышэйшы за мяне — не толькі ў фізічным плане, а і ў ментальным. У яго можна павучыцца стаўленню да навакольнага свету, якое складана сфармуляваць па выніках адной сустрэчы. Напрыклад, імкненню берагчы ўсё, што нас атачае, цаніць кожны момант жыцця, таму што ён чароўны і непаўторны, і не рабіць таго, што табе не падабаецца. Так проста, але так складана для большасці з нас...

«Вочы гараць — значыць, усё добра»

«Мы пазнаёміліся з Іванам, калі рыхтавалі студэнцкі арт-праект «Не такія» ў галерэі Універсітэта культуры. Праект завяршыўся, але засталося адчуванне, што можна даць яму працяг», — кажа **куратар праекта Лізавета Еліневіч.**

Ідэю Лізаветы падтрымала **фотограф рэлігійнай місіі «Беларускае каталіцкае таварыства «Карытас» Мінска-Магілёўскай епархіі Яна Роўда.**

«Гэта мой першы досвед арганізацыі падобнага праекта, — расказвае Янына. — Калі я ішла знаёміцца з Ванем, вельмі хвалявалася, бо нічога не ведала пра аўтызм. Але я дарэмна перажывала: ніякіх «адхіленняў», якія б мяне бянтэжылі, не было. Ён сустрэў нас з фотаапаратам, пастаянна здымаў, паказваў усе свае калекцыі, дубы, якія вырошчвае ў гаршках дома, фотаздымкі».

«Калі арганізоўваеш падобныя праекты, ты сам змяняешся і пачынаеш глядзець па-іншаму на многія рэчы, — дзеліцца Лізавета. — Ваня навучыў мяне многаму, у тым ліку праяўляць свае эмоцыі: хочаш узяць кагосьці за руку — бярэш. Хочаш запытаць нешта — пытаеш. У яго ўсё проста!»

Спачатку планавалася зрабіць невялікую фотавыставу. Але, як адзначаюць арганізатары, з тысяч Ваніных здымкаў, розных па якасці, настроі і змесце, было складана выбраць некалькі дзясяткаў.

«У выніку вырашылі зрабіць дзве тэматычныя экспазіцыі: першая — горад, які заўжды бачаць людзі; другая — Ваніны захапленні: мора, кнігі, прырода», — кажа Яна Роўда.

Паступова фотавыстава перарасла ў вялікі арт-праект «ФотаАўтызм», які, апроч экспазіцыі са здымкамі Вані Шаўцова, уключае шмат тэматычных мерапрыемстваў і майстар-класаў. У цэлым праект накіраваны на тое, каб творчыя асобы больш кантактавалі з таленавітымі людзьмі, якія не ўпісваюцца ў агульнапрынятыя ў грамадстве стандарты. Бо любому чалавеку патрэбна самарэалізацыя, і калі кожны з нас можа праявіць сябе ў розных сферах жыцця, то людзі з аўтызмам могуць зрабіць гэта толькі ў творчасці. Арганізатары ўпэўнены: калі цяперашнія намаганні дадуць плён і пачнуць з'яўляцца новыя падобныя імпрэзы, значыць, іх мэта будзе дасягнута, і свет стане крышачку бліжэйшым для людзей, якіх прынята лічыць «не такімі».

...Тым часам «віноўнік» свята вітаецца і фатаграфуецца з новымі гасцямі і заўважае, што ў яго ёсць шмат фота на марскую тэматыку, таму трэба арганізаваць фотавыставу пра мора. «У наступны раз арганізуем», — абяцае ў адказ Лізавета Еліневіч.

«Ваню падабаецца ўсё, што адбываецца тут, — усміхаецца мне прыемная светлавалосая жанчына — Ганна Шаўцова, маці фатографа. — Варта толькі зазірнуць у яго вочы: яны гараць, значыць, усё добра».

У межах праекта «ФотаАўтызм» да 25 студзеня ў музеі-майстэрні Заіра Азгура можна будзе пабачыць здымкі Івана Шаўцова, наведаць майстар-клас па фатаграфіі, спектакль тэатра лялек, паслухаць выступленні Паліны Рэспублікі, Андруся Такінданга і Кастуся Жыбуля, а таксама паглядзець фільм «Чалавек дажджу».

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фотаздымкі з архіва Івана Шаўцова.

«ПЕРШАЕ СЛОВА НА МАРСЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Якое стаўленне да праекта сярод навукоўцаў?

— Рэакцыі супрацьлеглыя. Хапае і скептыкаў, і тых, хто падтрымлівае нас. Гэта пераважна эксперты, якія «варацца» ў тэхналагічным асяродку. Галоўнае, што ідэю падтрымліваюць буйныя карпарацыі ў сферы будавання касмічных караблёў. Падобнае сведчыць аб тым, што праект даволі сур'ёзны. Зразумела, ідэя крыху авантурная, і ніхто не дасць 100 працэнтаў, што яна будзе цалкам рэалізавана. Таму для нас вельмі важным стане 2018 год, калі на Марс адправіцца першы беспілотны модуль. Палёт стане своеасаблівым індыкатарам паспяховасці. Калі праз чатыры гады здзейсніцца ўсё пажаданае, мяркую, погляды скептыкаў зменяцца кардынальна.

— Марс прыдатны для жыцця чалавека?

— Гравітацыя на ім хоць і меншая за зямную, але да яе можна прыстасавацца. І ў далёкай перспектыве Марс можна зрабіць прыдатным для жыцця. Вельмі важна і тое, што чырвоная планета багатая на рэсурсы і сыравіну. Дзякуючы гэтаму, можна будзе значна зменшыць залежнасць ад Зямлі.

Ці ёсць жыццё на Марсе?

— Размовы пра жыццё на Марсе вядуцца ўжо даўно. Як лічыш, ці могуць патэнцыяльныя марсіяне быць падобныя на герояў карціны Язэпа Драздовіча? — кажу і з усмешкай працягваю Міхаілу тэлефон з выявай галавастых і валасатых марсіян.

— Я вельмі паважаю творчасць Драздовіча, але такіх жыхароў там, на жаль, не сустрэнеш. Калі жыццё і ёсць на Марсе, то, хутчэй за ўсё, на ўзроўні мікраарганізмаў.



MARS ONE

Dear Mr. Michał Rumiancaŭ.

You and only 1057 other aspiring astronauts around the globe have been pre-selected as potential candidates to launch the dawn of a new era – human life on Mars. Congratulations. You have made it to the next round.

Now. Catch your breath.

We know you need details. We promise they are coming. In the meantime, here's what you need to know:

Дакумент, які пацвярджае выхад Румянцава ў другі этап праекта.

— Ты разумееш, што дарогі назад з Марса ўжо не будзе?

— Калі б яна і была, то пасля Марса адаптавацца да зямных умоў было б складана. Працяглае знаходжанне ва ўмовах нізкай гравітацыі выклікае незваротныя змены ў арганізме. Развіваецца астэапароз. Магчыма, гэта і добра, што на Зямлю ўжо не вернешся. Невяртанне — гэта адзін з тых маральных выбараў, якія варта зрабіць для дасягнення агульнай мэты. Я гатовы прысвяціць сваё жыццё даследаванню гэтай планеты.

— І як да гэтага ставяцца твае бацькі?

— Адмоўна. Мае сваякі жывуць у Лідзе, у нас добрыя стасункі. Маці спачатку не ўспрымала мае планы ўсур'ёз. Пакуль не прыйшлі вынікі адбору другога тура. Тады яна ўжо занепакоілася. Праўда, я ўсё роўна спадзяюся на тое, што бацькі мяне зразумеюць. Я дарослы чалавек, і гэта мой асабісты выбар.

— А ты не задумваўся, што да 2024-га года можаш ажаніцца і ў цябе народзіцца дзіця?

— За гэты час здарыцца можа сапраўды розное. Але для мяне галоўнае каб праект паспяхова развіваўся. І калі ў выніку мой удзел абмяжуецца прапагандаваннем, я таксама буду шчаслівым чалавекам. Праўда, калі ты адмовішся ад палёту ўжо на фінальным этапе падрыхтоўкі, можна проста паставіць пад пагрозу сам праект. Рабіць гэтага не хочацца.

Невяртанне — гэта адзін з тых маральных выбараў, якія варта зрабіць для дасягнення агульнай мэты. Я гатовы прысвяціць сваё жыццё даследаванню гэтай планеты.

Рамантыкі і рэалісты

— Дарэчы, як ты ставішся да іншых беларускіх удзельнікаў праекта?

— Яны для мяне найперш таварышы і аднадумцы. Я з імі шмат кантактаваў, зразумеў, што яны таксама ідэалісты, якія вераць у агульны поспех і ставяцца да ўсяго даволі сур'ёзна.

— Цябе не крыўдзіць, што вас называюць рамантыкамі і летуценнікамі?

— Не. Так і ёсць. І гэта пры тым, што я даволі рэалістычна гляджу на жыццё і веру ў наш праект і яго рэалізацыю. Усе вялікія пачынанні былі авантурнымі. Іх заўжды не разумелі. Але калі б чалавек не рабіў такіх крокаў, ён, напэўна, сёння сядзеў бы на дрэве з бананам у руцэ. Менавіта такія сумесныя намаганні змяняюць наш свет да лепшага.

— На хвілінку ўявім, што ты ўжо на Марсе. Якім чынам будзеш прапагандаваць сярод замежнікаў беларускую мову?

— Я ўжо паабяцаў сябрам, што першае слова на Марсе будзе сказана па-беларуску.

Тарас ШЧЫРЫ.

Наўздагон свяцу

КАЛЯДНЫЯ ВАКАЦЫІ НА БАЛТЫЦЫ

Стары горад Таліна — як на далоні!

Чаканне сапраўднай зімы зацягнулася: амаль увесь снежань за акном былі туман, слота і плюсавая тэмпература. А які без снегу святочны настрой? Таму ў яго пошуках напярэдадні каталіцкіх Каляд мы накіраваліся ў Скандынавію. Сябры і знаёмыя з непаразуменнем глядзелі на нас — лепш бы паехалі ў цёплую краіну пагрэцца... Але нам вельмі хацелася навагодняга цуду і адчування свята. Толькі вось шукалі мы снег, шукалі, ды так і не адшукалі. Балтыка сустрэла нас халодным ветрам, а Швецыя ўвогуле дажджом і тэмпературай +6. Наш маршрут: Талін — Хельсінкі — Стакгольм — Рыга.

Чырвоныя дахі і світары

Талін немагчыма ўявіць без галоўнай яго славутасці — гарадской сцяны. Магутная каменная агароджа вышынёй каля 20 метраў была пабудавана па перыметры горада ў XIII стагоддзі і служыла надзейнай абаронай ад нападаў варожых войскаў. Сярэднявечная гарадская сцяна Таліна складалася амаль з паўсотні высокіх вежаў. На сёння іх захавалася ўдвая менш, але ад гэтага збудаванне не выглядае менш велічным. А якія краявіды з іх можна назіраць! Стары горад — нібы на далоні. Што ж, зразумела, чаму чырвоныя дахі Таліна так прыцягвалі ўвагу рэжысёраў.

Сэрца Старога горада — Ратушная плошча. Менавіта яна на працягу многіх стагоддзяў была для гараджан цэнтрам гандлю, сходаў, народных гулянняў і рыцарскіх турніраў. Цяпер на ёй размясціліся шматлікія кавярні і рэстараны. Выпіць цёплага грогу, пачаставацца нацыянальнымі стравамі ды прыкупіць сувеніраў на памяць — напэўна, самае прыемнае баўленне часу перад святамі. Візітная картка горада — цудоўныя самаробныя вырабы з воўны: світары з аленямі, шкарпэткі і гольфы, шапкі і рукавіцы... Праўда, кошты на ручныя эксклюзівы не самыя танныя: світар, напрыклад, каштуе ад 50 еўра, шапка — ад 25.

Краіна камянёў і мумі-троляў

З чароўнай Фінляндыяй мяне звязваюць самыя цёплыя ўспаміны — у гэтай краіне я была некалькі разоў. Апошні раз — дзесяць гадоў назад, таму перад «сустрэчай» хвалявалася, едучы нібы на спатканне. Фіны да прыроды ставяцца з вялікай павагай. Уздоўж аўтастрад стаяць вялізныя глыбы, якія амаль усе... падсвечаны. Калі на полі, што засяваюць збожжам, расце дрэва ці ляжыць валун, тэхніка акуратненька іх абыходзіць, каб не нашкодзіць, хаця значна прасцей тое самае дрэва ссячы. Але гэта не пра фінаў. Для іх самае лепшае месца на свеце — свой дамок і саўна на беразе возера (а азёраў, дарэчы, у Суомі больш за 180 тысяч). І, як жартуюць самі фіны, лепш за ўсё, каб адлегласць да бліжэйшых суседзяў была кіламетраў пяць, не менш! Жарты жартамі, але на каталіцкія Каляды ў сталіцы краіны Хельсінкі акрамя турыстаў, здавалася, не было ні душы. Працавала толькі прадуктовая крама (і гэта было сапраўдным цудам) ды сувенірная. Але ж паглядзець мы паспелі шмат чаго.

Каля трыццаці працэнтаў плошчы горада адведзена пад паркі і адкрытыя пляцоўкі. Тут паўсюдна шмат камянёў. Вялікая праваслаўная царква ў Каліа размешчана ў цэнтры раёна, на высокім камяністым узгорку. А помнік вядомаму фінскаму кампазітару Сібеліусу стаіць на вялізнай глыбе і прываблівае турыстаў сваёй незвычайнай формай: з пастамента на апорах падымаюцца арганныя трубы рознай даўжыні і канфігурацыі. Агульная вага помніка — 24 тоны!

Большасць музеяў на Раство таксама не працавала, але нам пашчасціла трапіць у марскі цэнтр Sea Life. У гэтым гіганцкім акіянарыуме маецца больш за пяцьдзясят акварыумаў з марской вадой: ад невялікіх з каралавымі рыбкамі, медузамі, марскімі канькамі да велізарных басейнаў з серабрыстымі касякамі селядцоў. Гонар марскога цэнтра — акулы, у развядзенні якіх фінскія спецыялісты сталі самымі паспяховымі. Пад басейнам з такімі пачварамі знаходзіцца шкляны тунэль, які дазваляе назіраць за гэтымі небяспечнымі марскімі насельнікамі.

Візітная картка Таліна — цудоўныя самаробныя вырабы з воўны: світары з аленямі, шкарпэткі і гольфы, шапкі і рукавіцы.

Безумоўна, калі распавядаць пра Фінляндыю, абавязкова трэба ўзгадаць мумі-троляў — чароўных персанажаў, створаных фінскай пісьменніцай, мастачкай і ілюстратарам Туве Янсан. Мумі-тролі — далёкія нашчадкі скандынаўскіх троляў, белыя і круглявыя. Кніжкі менавіта з гэтымі казачнымі персанажамі чытаюць нанач мамы і таты ўсяго свету. Таму пабываць у Суомі і не прывезці з сабой «муміка» — проста недаравальна!

Кароль, Карласан і карабель

Наступны пункт нашай вандроўкі — адзін з найпрыгажэйшых сталічных гарадоў свету Стакгольм, што размяшчаецца на 14 астравах, злучаных 57 мастамі. Горад славіцца сваёй архітэктурай, зялёнымі паркамі і вельмі чыстым паветрам. Дарэчы, менавіта тут знаходзіцца першы ў свеце Нацыянальны гарадскі парк — сапраўдныя зялёныя «лёгкія» вялікага горада.

Мы сышлі з парома зусім рана, калі стаяла цемра, і гід папярэдзіў нас, што такое «асвятленне» можа заставацца на працягу ўсяго дня. Метоўнасць і з'яўляецца адной з найпапулярнейшых славутасцяў не толькі Стакгольма, але і ўсяго свету.

Вядома, напрыканцы трэба абавязкова прагуляцца па гістарычнай частцы горада, дзе можна пабачыць дах, на якім сядзеў Карласан, міфічныя руны вікінгаў...

Брэменскія музыкі і святочныя ёлкі

Начны пераезд у Рыгу на пароме запоўніўся сапраўдным марскім штормам. Гайдала так моцна, што ў каюце скакала амаль усё. Таму на латвійскую зямлю мы ступілі значна «патрапаныя». Але горад нас зачараваў, бо, самае галоўнае, Рыга — радзіма навагодняй ёлкі! Менавіта ў гэтым горадзе на галоўнай рынкавай плошчы ў 1510 годзе было ўстаноўлена першае ў свеце святочнае дрэва. Незвычайныя ёлкі (напрыклад, з цэглы і шкла) у Рызе можна сустрэць у самых нечаканых месцах. Ёсць нават спецыяльна распрацаваны «ёлачны» шлях!

Безумоўна, самая цікавая частка Рыгі — стары горад, дзе размяшчаецца Домскі сабор, вядомы сваёй бліскучай акустыкай і адным з лепшых у Еўропе арганаў. Самая старажытная ў горадзе царква — Святога Якаба, у якой захаваліся некаторыя элементы гатычнай архітэктуры, раней уласцівыя і астатнім гарадскім храмам.

Тут жа і «кінематаграфічная мека» Рыгі — вуліца Яўніела. У кінастужцы «Сямнаццаць імгненняў вясны» на гэтай вуліцы знаходзілася канспіратыўная кватэра, а ў фільмах пра Шэрлака Холмса на ёй размяшчаўся дом славутага сышчыка.

Месца, якое не могуць не наведаць турысты, — гэта помнік Брэменскім музыкам. Кампазіцыя, усталяваная ў Старым горадзе ў 1990 годзе, ужо добра пацёртая, бо існуе прыкмета, што для здзяйснення жадання трэба памацаць пысы ўсіх герояў.

Калі Фінляндыя і Швецыя здаліся далёкімі для нашага менталітэту, то ў Рызе мы адчувалі сябе амаль як на радзіме. Тут ва ўсю святкавалі Раство і Новы год — святочным кірмашам радаваліся і дарослыя, і дзеці. Дарэчы, у вандроўцы мы яшчэ расплачваліся латамі, бо з 1 студзеня краіна адмовілася ад уласных грошай і перайшла на еўра.

На пароме не разгуляешся

А цяпер пра тое, што ўсіх цікавіць. Пра кошты. Аўтобусна-паромны тур «Мінск — Талін — Хельсінкі — Стакгольм — Рыга — Мінск» каштуе 330 еўра на чалавека (у гэтую суму ўваходзяць толькі сняданкі). Тур доўжыцца 4 дні з адным начным пераездам у аўтобусе. Дадаткова аплачваюцца шэнгенская віза і страхоўка.

У кожнай краіне падсілкавацца каштуе па-рознаму. Самыя дарагія ў гэтым плане — Фінляндыя і Швецыя. Тут адзін паход у самую танную кавярню каштуе ад 15 еўра з чалавека.

У Стакгольме зусім сціплы набор у вядомай міжнароднай сетцы фастфуду абышоўся нам у 20 еўра на дваіх. І гэта лічыцца вельмі танна, бо калі захочацца пасядзець удваіх у кавярні ці рэстаране, за гэтае задавальненне давядзецца выкласці з кішэні ад 40 да 90 еўра.

Цікава, што ва ўсіх кавярнях Швецыі дзейнічае наступнае правіла: калі ты заплаціў за кубак кавы (прыкладна 2 еўра), то некалькі кубкаў можна дазволіць сабе выпіць ужо бясплатна.

Дарэчы, шведы набываюць адзенне толькі па зніжках. У астатніх выпадках аддаюць перавагу шопінгу ў... Літве ці Эстоніі. І не дзіва: тыя ж самыя рэчы ў Стакгольме ў два-тры разы даражэйшыя, чым у суседзяў.

Рыга — радзіма навагодняй ёлкі! Менавіта ў гэтым горадзе на галоўнай рынкавай плошчы ў 1510 годзе было ўстаноўлена першае ў свеце святочнае дрэва.

У Фінляндыі мы змаглі трапіць толькі ў прадуктовую краму. Пачак добрай фінскай кавы тут каштаваў ад 2 да 5 еўра, шакалад (100 грамаў) — ад 1 да 3 еўра. Звычайная вада ў паўтаралітровай бутэльцы абыдзецца ў 1 еўра, а кілаграм мандарынаў — 1,35. Ва ўсіх кавярнях і рэстаранах Суомі кубачак кавы каштуе 2 еўра. І ні цэнта больш! Фіны вельмі паважаюць гэты напой і выпіваюць да дванаццаці порцый за дзень, таму сімвалічны кошт за кубачак кавы трымаецца ў Фінляндыі на працягу многіх гадоў.

Куфель піва ў талінскім рэстаране каштуе прыкладна 4-5 еўра, піца — 15 еўра, салата — ад 7 да 10 еўра. У бістро кошты, безумоўна, значна ніжэйшыя. Добра пад'есці на дваіх нам каштавала каля 15 еўра. У Таліне мы праехаліся з цэнтра горада да нашага гатэля на аўтобусе. Білет на аднаго чалавека каштаваў 1,6 еўра — неверагодныя для беларусаў грошы.

Але, мабыць, самую дарагую ежу прапануюць турыстам усё ж на паромах, якія курсуюць па Балтыйскім моры паміж краінамі. За вячэру на аднаго чалавека (шведскі стол) трэба заплаціць 32 еўра, з алкаголем — на 2 еўра больш. А вось сувенірная прадукцыя, што было дзіўна, аказалася на пароме таннейшай. Тыя ж самыя магніцікі можна было набыць не за 5 еўра, а за 3,5 еўра. І не кажыце: дробязь, але прыемна...

Марына АНТОНЕНКА.
Фота аўтара.

Музей аднаго карабля.


Акулы ў марскім цэнтры Sea Life, Хельсінкі.

«Брэменскія музыкі».

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
16 01 2014 г.

УВАГА, АЎТАРЫ!

Другі месяц запар «Чырвонка» друкуе на сваіх старонках творчыя работы маладых няштатных аўтараў, якія паступілі на конкурс «Мы — такія!..» Усяго на сёння ў рэдакцыю дасланa ўжо каля паўсотні такіх «проб пяра» і, думаецца, гэта яшчэ далёка не ўсё. Нам пішуць з самых розных куточкаў краіны, дасылаюць матэрыялы розных жанраў... Думаем, і чытачы ўжо паспелі заўважыць, што многія работы па-сапраўднаму цікавыя.

Таму чарговы раз хацелася б звярнуцца да нашых маладых аўтараў і нагадаць ім, што на старонках «Чырвонкі» будуць надрукаваны ЛЕПШЫЯ творчыя працы з дасланых. Матэрыялы да ўдзелу ў ім прымаюцца ТОЛЬКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ УМОВАМ КОНКУРСУ. Больш падрабязна азнаёміцца з імі можна ў нумарах ад 26 верасня і 31 кастрычніка мінулага года або на сайце газеты.

Тым не менш мусім яшчэ раз коратка нагадаць, што тэксты трэба дасылаць (калі гаворка ідзе пра электронную пошту) у фармаце RTF. КОЖНАЯ ілюстрацыя ці фотаздымак дасылаецца АСОБНЫМ ПРЫМАЦАВАНЫМ ФАЙЛАМ. Калі ласка, не трэба завёрстваць здымкі ў тэкст, як гэта робіцца пры афармленні школьных рэфератаў ці насценнай газеты!

І яшчэ. Не забывайцеся пазначаць ХАТНІ АДРАС (з паштовым індэксам), КАНТАКТНЫЯ НУМАРЫ ТЭЛЕФОНАЎ і ПАШПАРТНЫЯ ЗВЕСТКІ АЎТАРАЎ (кім і калі быў выдадзены пашпарт, нумар, асабісты нумар, імя, імя па бацьку, прозвішча). ТОЛЬКІ пашпартныя звесткі павінны быць НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ. Калі ў дзіцяці яшчэ няма пашпарта (пасведчанне аб нараджэнні не падыходзіць), дасылаюцца поўныя пашпартныя звесткі АДНАГО З БАЦЬКОЎ.

«ХВІЛІНА СЛАВЫ» ЗАПАЛЬВАЕ ШКОЛЬНЫЯ «ЗОРКІ»

Школьнае жыццё — непаўторны, цікавы час: урокі, сябры, справы і мары. Але запамінаюцца самыя адметныя моманты, тыя, калі адчуваеш сябе «зоркай» на школьным «небасхіле», калі раптам цябе заўважае ўся школа.

Даць магчымасць адчуць сябе такой «зорачкай», зрабіць суботні школьны дзень насычаным і асаблівым — такой была мэта агульнашкольнага агляду-конкурсу «Хвіліна славы», які прайшоў у нашай сярэдняй школе № 4.

Дзве суботы запар таленавітыя і актыўныя вучні з першага па адзінаццаты клас дэманстравалі свае здольнасці ў чатырох намінацыях: харэаграфія, музычны жанр, мастацкая творчасць, арыгінальны жанр. У перапоўненай зале сабраліся вучні, класныя кіраўнікі, бацькі — усе падтрымлівалі сваіх прадстаўнікоў! Ніхто не застаўся абыякавым: хвалявaліся і дапамагалі, засмучаліся і радаваліся.

Журы пад кіраўніцтвам дырэктара школы Антаніны Яўгенаўны Мазуры было прыемна ўражана цікавымі і разнастайнымі выступленнямі. Найбольш канкурсантаў выбралі вакальны жанр: тут і песні на роднай мове, і сучасныя кампазіцыі, і выступленні па-англійску. Запамінальнымі былі нумары Вікторыі Майніч, Дар'і Ждан, Юліі Пятровай, Вольгі Качан, Валерыі Бобіч, Паліны Брыкман, Паліны Гаўраш.

Кожны марыў здзівіць, таму склaліся дуэты, гучалі песні пад акампанемент гітары, а Вераніка Пучыла ўдзельнічала разам з мамай, выканаўшы ў суправаджэнні акардэона п'есу на цымбалах. Пасучаснаму гучала нават балалайка Паўла Ківача ў час выканання «Карабейнікаў».

Па-майстэрску і натхнёна выступілі танцавальная група 6 «А» класа з танцам «Бліскучы рок-н-рол», групы «Тандэм» 7 «А» і 9 «А» класаў з нумарамі «Крок наперад» і «Rolling in the deep» (кіраўнік Родзька Т.Н.). І, вядома, гучалі вершы: узнёсла, пранікнёна і ад усяго сэрца. Але найбольш уразіла вучаніца 9 «А» класа Вераніка Танкевіч — уся зала не магла стрымаць слёз, слухаючы верш «Не раз уже в заштопанном халате».

Хто б мог падумаць, што ўзбітыя вяршкі, кіпень і шакалад стануць інструментамі для стварэння мастацкага нумара!

Самым арыгінальным нумарам стаў незвычайны майстар-клас «Кава-хаўс», падрыхтаваны Іванам Ходарам і Аляксандрам Сіневічам з 7 «Б» класа. Хто б мог падумаць, што ўзбітыя вяршкі, кіпень і шакалад стануць інструментамі для стварэння мастацкага нумара! А дабаўце да гэтага цудоўны пах кавы... Пасля выступлення гледачы не толькі гучна апладзіравалі, але і змаглі паспытаць шэдэўр «кававага мастацтва».

А юныя ўдзельнікі, вучні пачатковых класаў, як сапраўдныя артысты дэманстравалі ўдалае спалучэнне творчасці і мэтанакіраванасці. Многія прыгожа і эмацыянальна танцуюць, выдатна чытаюць вершы, хораша спяваюць. Журы адзначыла выступленні Карыны Аліевіч, Карыны Качан, Дзіяны Каратай, Ангеліны Навашыцкай, Генадзя Макоўскага, Яўгеніі Краскоўскай, вакальных груп 4 «Б», 4 «В»,3 «В» і 1 «Б» класаў. Некаторыя ўжо вельмі добра валодаюць музычнымі інструментамі: вучань 3 «Б» класа Роберт Гулевіч — саксафонам, вучань 4 «В» Міхаіл Каравай — валторнай, вучаніца 3 «В» Марыя Семянчук — скрыпкай.

Конкурс стаў яскравай і адметнай з'явай, якая аб'яднала дзяцей і дарослых. Школа, напоўненая натхненнем і ідэямі, рыхтуецца да фіналу, які пройдзе ў лютым і будзе прымеркаваны да Дня абаронцаў Айчыны. І не важна, хто стане пераможцам, бо галоўнае ўжо здзейснена — новыя «зорачкі» засвяцiліся. Поспехаў вам, юныя артысты!

Вадзім ГАЛУШКА,
вучань 8 класа СШ № 4
г. Навагрудка.

ПРА АЎТАРА

— Маё галоўнае захапленне — журналістыка, — кажа пра сябе 14-гадовы аўтар. — Вельмі люблю вандраваць, знаёміцца з новымі людзьмі, вывучаць невядомае. Я адкрыты і таварыскі, таму ў мяне шмат сяброў і аднадумцаў. Акрамя журналістыкі, займаюся каратэ, актыўна ўдзельнічаю ў жыцці сваёй школы. У будучыні хачу звязаць сваё жыццё з журналістыкай і працаваць карэспандэнтам або тэлерадыёвядучым. Лічу, што гэта вельмі цікавая і сучасная прафесія, яна дапамагае чалавеку адкрываць свет.

Вадзім уваходзіць у аб'яднанне юных журналістаў СШ №4 пад кіраўніцтвам настаўніцы Алены Іосіфаўны Пятровай. Вось што кажа яна: «З цікавасцю даведаліся пра конкурс «Мы — такія!..» і вырашылі прыняць удзел. Наша школа — адна са старэйшых у горадзе. Вучыцца ў ёй цікава, бо школьнае жыццё ніколі не стаіць на месцы: святы, конкурсы, сустрэчы, экскурсіі і шмат іншага. Хочацца расказаць пра гэта, каб усе ведалі, якія яны — сённяшнія вучні. Дасылаем вам рэпартаж з конкурсу «Хвіліна славы» вучня Вадзіма Галушкі».

ВЕРЫ І ДАБРЫНІ НАШЫМ СЭРЦАМ

Мітрапаліт Ніжагародскі і Арзамаскі Георгій, ураджэнец Жлобіна, калісьці вучыўся ў сярэдняй школе № 6, у якой сёння вучуся я. Пры асабістай сустрэчы з уладыкам я задала некалькі пытанняў.

— Васіль Цімафеевіч *(свецкае імя суразмоўцы. —* **Аўт.***),* ***раскажыце, калі ласка, пра сваю сям'ю.***

— У сям'і перш за ўсё на цябе вялікі ўплыў аказваюць старэйшыя браты і сёстры. Бацькі — гэта «свая» тэма выхавання, а вось калі ты расцеш, дзе хтосьці за цябе не нашмат старэйшы, хтосьці маладзейшы... Я быў апошні ў сям'і, самы любімы. Ды ўсе слухалі бацькоў. На нас накладаліся нейкія абавязкі па гаспадарцы, мы іх выконвалі.

— Што цікавіла вас найперш у школьныя гады?

— Ваенная тэма. Яна для мяне заўсёды была блізкая — і ў дзяцінстве, і ў юнацтве. І, можа быць, я не маю ўжо такой магчымасці чытаць літаратуру, але заўсёды, калі думкі вяртаюцца да ваеннай эпохі, калі бачу ветэранаў, то адчуваю нейкае асаблівае духоўнае трапятанне, глыбокую павагу. Я нарадзіўся ў тым асяроддзі, памятаю тых людзей, таму тэма подзвігу, самаадданасці, служэння — галоўныя для мяне. Я нарадзіўся на беразе Дняпра, там стаяў фронт больш за дзесяць месяцаў, там бліндажы, акопы... Калі мы бачылі чалавека ў пагонах, мы яго абагаўлялі. Таму тэма абароны Радзімы была мне заўсёды вельмі блізкая. Нейкі час мы хацелі быць разведчыкамі, потым — лётчыкамі, абмяркоўвалі тэму космасу. Я думаю, што гэта быў дзіцячы, падлеткавы час, калі сэрца гарэла жаданнем здзейсніць подзвіг для Радзімы, народа... Выходзячы з гэтай установкі, выпрацоўваліся крытэрыі сістэмы каштоўнасцяў у жыцці.

— А што вы памятаеце пра студэнцтва?

— Прыгадваю свае студэнцкія гады ў семінарыі, акадэміі... Я чуў ад многіх людзей старэйшага пакалення, якія былі сведкамі разбурэння храмаў, як яны казалі: маўляў, навошта аднаўляць, навошта столькі сіл укладваць? Усё роўна ўзарвуць, усё роўна зачыняць. Я сутыкаўся з такім песімістычным настроем, але ён мне не перадаўся. Займаючыся захаваннем старажытнасцяў, ты ўключаешся ў гісторыю, але не тэарэтычную, а практычную. Калі ты даведваешся гісторыю Успенскага сабора Троіца-Сергіеўскай лаўры, то разумееш, што яна сумная. Пётр I там маліўся, Дзмітрый Данской там маліўся... Гэтая тэма табе становіцца вельмі зразумелай і блізкай. Затым ты падступаеш да дойлідства, іканапісу... Нейкія ювелірныя вырабы... Вывучаючы гісторыю Троіца-Сергіеўскай лаўры, ты акунаешся ў гісторыю ўсёй Расіі. І ты разумееш, што тое, чым ты займаешся, — гэта працяг сувязі часоў. Гэта напаўняе тваю душу вельмі вялікім духоўным сузіраннем.

— Вы адзін з тых, хто мае дачыненне да аднаўлення манастыроў, храмаў...

— Вось такі прыклад, як Дудзін манастыр... Уяўляеце, яму больш за шэсцьсот гадоў! Вось колькі стагоддзяў там здзяйснялася малітва... Там зямля ўжо прасякнута святасцю. І адраджаючы такія старажытныя святыні, мы ажыццяўляем сувязь паміж небам і зямлёй. І я бачу, колькі нават да гэтых руін цягнецца моладзі, дзяцей, дарослых. І людзі вельмі часта знаходзяць такія месцы, сваю дарогу да Бога.

Бог даў чалавеку звод законаў, правілы паводзін, правілы жыцця, жывучы па якіх чалавек будзе ладзіць свой дабрабыт і на зямлі і на небе. А сучасная цывілізацыя ўсё больш ідзе па шляху адмовы ад гэтых запаведзяў, ад гэтага зводу правілаў жыцця.

— Гавораць пра канец свету, апакаліпсіс... Што вы думаеце наконт гэтага?

— Пра гэта памятаць трэба, але захапляцца нельга. Справа ў тым, што ў Святым Пісанні ў «Апакаліпсісе» сказана, што нават анёлы не ведаюць даты канца свету. Прыкметы яго будуць нам паказаны. І, перш за ўсё, святыя айцы кажуць, гэтыя прыкметы з'явяцца, калі маральнасць і духоўнасць у людзей пачне знікаць. Бог даў чалавеку звод законаў, правілы паводзін, правілы жыцця, жывучы па якіх чалавек будзе ладзіць свой дабрабыт і на зямлі і на небе. А сучасная цывілізацыя ўсё больш ідзе па шляху адмовы ад гэтых запаведзяў, ад гэтага зводу правілаў жыцця. І мы пішам іншыя правілы, якія царква называе багаборніцкімі. Таму ўсё залежыць ад нас з вамі — наблізіць канец свету або яго аддаліць.

— Што вы думаеце пра сучаснае жыццё?

— Часта, ацэньваючы яго, магу мець нейкія заўвагі да свецкага ладу жыцця — у душы. Але публічна імкнуся іх не выказваць. Я сябе спыняю. «Скажы, брат Георгій, а ў тваім служэнні ў цябе ўсё добра, у цябе ўсё пабудавана?» Высвятляецца, што не. Не хапае кадраў, не хапае храмаў, не хапае матэрыяльных сродкаў, можа быць, не хапае вопыту ці старання. І я сабе кажу: «У тваёй дзейнасці ёсць шмат месца для ўдасканалення. Таму ты ўжо больш глядзі на сваю паслухмянасць, на сваё служэнне». І вось, калі ты так сябе настройваеш, то ў тваёй душы з'яўляюцца святло і пакора.

— Ва ўсіх розная формула поспеху, а як бы вы яе вызначылі?

— Я б сказаў коратка. Гэта любоў. Любоў па-старажытнахрысціянску — гэта трываць доўга, не зайздросціць, не раздражняцца, не радавацца з няпраўды, а разам цешыцца з ісціны. У чым сэнс, калі на сучасную мову перакласці? Любоў прадугледжвае спачуванне і служэнне, а гасподзь у Святым Пісанні сказаў: «Бог ганарлівым пярэчыць, а пакорным дае міласць». І каб атрымаць гэтую ласку, чалавек павінен ісці па шляху служэння. Бо, пагадзіцеся, мы ўсе хочам, каб у нашых сэрцах былі мір, дабрыня і спакой.

Надзея ГАЎРЫЛЕНКА,
вучаніца 11 класа
сярэдняй школы № 6
г. Жлобіна.

ПРА АЎТАРА

Надзеі нядаўна споўнілася 17 гадоў. Пра сябе яна гаворыць наступнае: «Пакольку я захапляюся гісторыяй і краязнаўствам, не раз пісала навуковыя работы. Мяне прываблівае гэты занятак тым, што, маючы зносіны з людзьмі, спазнаючы іх лёс, я знаходжу нешта новае для сябе. Мне неабыякавыя гісторыя майго горада, лёсы людзей, таму ў сваіх работах я стараюся расказаць пра гераічныя подзвігі маіх землякоў, пра іх уклад у развіццё Жлобіншчыны. Выпадковыя сустрэчы ў маім жыцці заўсёды шмат значылі і многаму навучылі. Для мяне гэта бясцэнны вопыт».

Яшчэ Надзея, як і многія дзяўчаты яе ўзросту, вельмі любіць бавіць час за чытаннем кніг. «Разам з сябрамі мы ўдзельнічаем у гульнях КВЗ. Гумар дастаўляе мне каласальнае задавальненне. За жартамі я забываю аб праблемах, магу адпачыць душой. Я веру ў тое, што смех падаўжае жыццё. Гэтак жа як і спорт, да якога я таксама не магу стаўвіцца абыякава».

Сваю будучыню Надзея хацела б звязаць з гісторыяй. «Гісторыя — гэта нешта неверагоднае, яна захапляе! Я ўпэўнена, што за сваё жыццё зраблю шмат розных рэчаў, якімі будуць ганарыцца мае дзеці!»

Апавяданне

ДЗЕТАЧКІ...

Дар'я ЛЁСАВА

Гэтая аўтарка нездарма ўзяла за псеўданім крышку зменены прозвішча: Лосева — Лёсава. Нездарма, бо піша пра чалавечыя лёсы. І так цёпла ў яе атрымліваецца пісаць нават пра самае халоднае, нават пра балючае, што нешта ў сэрцы чытача пераварочваецца. Каб пераканацца, варта прачытаць хаця б некалькі апавяданняў, што друкуюцца ў «Маладосці». Адно з іх прапануем і чытачам «Чырвонкі».

— Вой, гэтыя мужыкі! Яны ж, як дзеці! За імі вока ды вока трэба! Выйдзеш замуж — глядзі мужа, як сваё вока! Гэта твой ордэн, тваё сэрца! Дарма, што каторая матляне спадніцай ля яго, голае каленца пакажа, а ты яму два пакажы! І яшчэ карацейшую спаднічку надзень! Мужыкі толькі ў шэсцьдзесят гадоў пачынаюць разбірацца ў жаночай красе, тады і жонку сваю раптам пачынаюць цаніць, бачыць, якая яна прыгожая!

— Мама, ты звар'яцела! Хіба можна непаўналетняй дзяўчынцы, тым больш дачцэ, пра такое далдоніць?! — абуралася я.

— Можна, яшчэ як можна! І трэба! Вунь што за акном робіцца! І не сярод ночы нават!

— То ж дыскатэчныя, мама! І мяне туды, на танцы-шманцы, не цягне!

— А халера б іх усіх пабрала! Ці ж то людзі будуць! Што з іх станецца, калі яно ўжо, смаркатае, цябе, старэйшага, не шануе, не саромеецца. Божа, Божа, свет дагары стаў! І не тое што дагары! Пры маёй памяці такога не было. У залатым часе мы жылі. Нас у школе вучылі павазе да старэйшых, у школу мы хадзілі акуратна, сціпла адзетыя. Была форма. З белымі каўнерыкамі, такімі ж манжэтамі; фартушкамі чорнымі ў будзень, белымі — на свята. І галоўкі ва ўсіх былі — люба глянуць! Дзяўчаткі з коскамі, банцікамі ці акуратнымі стрыжкамі, калі ў каго валасы рэдкія. А каб хто падумаў нафарбавацца, навесці вусны, бровы — таго б са школы выперлі! А калі каторая б пачала без сораму з хлапчукамі раманы круціць...

— А каханне, мама?

— Усяму свой час, дзіцятка. У школьныя гады трэба да кніжкі кідацца, розуму набірацца. Без розуму аніяк нельга. Што вы ў тым каханні яшчэ разумееце! Во як ты летась чарнела, паміралa ад кахання да Стасіка-аднакласніка. А што ў ім? Пустата! Акрамя штаноў, нічога ў ім! Я, як зірнула на яго, — мяне адвярнула. Чурбан нейкі! І ў гэту цурку закахалася мая дачка! Дзякуй Богу, што твая сяброўка адбіла яго ад цябе. Я так радавалася... Нашто ён табе! Во Волечцы ён — якраз! Там і маці, ты кажаш, ужо заклапочаная, як дачку замуж хутчэй аддаць. Гэта ж трэба, маці яе пры табе ляпнула, каб шукала Волечка сярод аднакласнікаў сабе мужа, і чым раней, тым лепей... Хоча дзіцёнка хутчэй гадаваць!..

— Мама, нашай Віцы шаснаццаць, а яна ўжо замуж ідзе! Яе мужык у школу правёў, а фізічка ўбачыла і пачала распаляцца: «Трэба ў фізіку болей углядацца, а не ў хлапцоў, Віка! Што ты ўсё па завуголлях трэшся з гэтымі жэўжыкамі?! Пакуль гора сваёй матцы ў падоле не прынясеш!» А яна ёй у адказ ведаеш што, мама? «Гэта ж муж мой, Таццяна Фёдараўна! Мы ўжо два гады разам жывём, у гэтую нядзелю распісваемся! Яго з дому выгналі, а мы з мамай падабралі і во — мужык што трэба аказаўся!»...

❐❐❐

Віка стаіць ля дошкі, і на яе звернута ўся ўвага аднакласнікаў.

— А дзе ж вы там у адным пакойчыку месціцеся, Віка? У вас жа інтэрнацкі пакой з мамай.

— Нічога. Абы мужык добры быў. А мой Хведзька добры. Вось жа не кінуў мяне, да шлюбу ідзе. А там, глядзіш, і яго старыя адыдуць, памякчэюць, нас у свае харомы прымуць. Куды дзенуцца — адзіны сынулька!

— Далёка глядзіш, Віка! — кідае ёй фізічка.

— І вы б так глядзелі, калі жыць няма дзе. Федзька багаты, у яго бацькоў толькі птушынага малака не хапае.

— Божа, Божа! — стогне ўжо за настаўніцкім сталом Таццяна Фёдараўна. — Што дзеецца?! Мы ж, бывала...

— Не трэба вашых павучанняў, Таццяна Фёдараўна. Мы ўжо дарослыя і добра бачым, што вакол робіцца. І як залатыя медалі атрымліваюць, бачым! Во прывялі ў наш 11-ы новенькага з гімназіі, у якой мая знаёмая вучыцца. Тая мне і расказала, што ў іх многія настаўнікі незгаворлівымі аказаліся, ні за што высокія балы не ставяць ні па мовах, ні па літаратурах, ні па гісторыі гэтаму ёлупню, сынку вялікага начальніка, тады яго сюды перакінулі! І, уявіце сабе, прымацавалі нашу Сашку да яго, каб дапамагала яму па гэтых прадметах: тая тлумачыць, тлумачыць, а ўсё безвынікова! Ну не дадзена яму, не дадзена гэта! Во толькі матэматыка. Дык гляньце, ён у Сашкі паспісвае кантрольныя, яму ні за што выдатныя адзнакі ставяць! Сёння яго няма, а каб і быў, — сказала б! Надакучыла глядзець на гэтага слюнчыка! Як лёгка яму жывецца! А ці чуў хто з нас яго адказы па літаратуры, гісторыі, мовах? Ніхто не чуў! А зазірнулі ў журнал — дзявяткі-дзясяткі адны, лепшыя адзнакі, чым у нашай Сашкі! На медаль цягнуць! Ды чаму тады вы, Таццяна Фёдараўна, не завышаеце нашай Сашцы адзнакі? Адна фізіка і хімія ў яе — тормаз, а так выдатніцай была б! Дык свайму чалавеку — дулю, а збоку хлопчыку-красунчыку — калі ласка! Цьфу! — Віка не ўтрымалася ад гневу, сціснула кулачкі і ўскрыкнула: — Цяпер разумееце, Таццяна Фёдараўна, чаму я замуж так рана падалася?! Таму што мы з мамай душымся ў інтэрнацкім пакойчыку, і нам нічога нідзе не свеціць. Няма аніякіх сувязяў, каб прабіцца куды! Мама мая — савецкая, былым усё жыве, а на дварэ — XXI стагоддзе! І новы час настаў, новая моладзь, новыя бацькі, а мая мама — старая, уся пакалечана жыццём, не разумее гэтага, не ўспрымае. Толькі плакаць можа, а не дзейнічаць! Во я, маладая, і ўзялася ратавацца. А што, прападаць мне? Ну, вучуся дрэнна... Ды таму, што часу няма на вучобу, трэба зарабляць нешта, каб жыць.

Таццяна Фёдараўна ва ўсе вочы глядзела на сваю вучаніцу, як не пазнавала яе. Доўга маўчала, але ўсё ж у глыбокім задуменні ціха вымавіла:

— Ты ў многім маеш рацыю, дзяўчынка мая. Жыццё цяпер дужа складанае. Рэзкі падзел на багатых і бедных даў свой вынік. Але чалавек заўсёды застаецца чалавекам, і той, хто быў ім, — той і сёння сярод добрых людзей. І беднаму дапаможа, і сляпога, глухога не кіне ў адчаі. Ну, а што наконт настаўнікаў — усё бывае і тут. Але ёсць настаўніцкі этыкет, ёсць мараль, закон, пераступіць якія не мае права ніхто з нас, — завяршыла сваю думку Таццяна Фёдараўна.

Але тут зноў узвілася асмялелая, не падобная да сябе, Віка:

— Вой, не трэба вашых павучанняў, Таццяна Фёдараўна! Мы ведаем, колькі трэба заплаціць, каб паступіць у гімназію, калі бацькі неўплывовыя, без пасад... Мы ведаем, чаму ў нашых класах так многа «бізнесоўскіх» дзетак... Ведаем, што нават у ВНУ ёсць такія лазейкі для абраных, што ніхто і сёння на іх не выйдзе!

— А што я вам падкіну, калі ўжо на тое пайшло... — нечакана ўбілася ў гаворку наша заўсёды маўклівая Каця. — Праўда, мама прасіла, каб я пары з зубоў на гэты конт не выпускала... Але раз ужо ў нас такая шчырасць палілася, не магу ўцярпець і я... — крышку сумеўшыся, патлумачыла наша сяброўка і ўжо рашуча пачала: — Ведаеце, да нас у госці часта завітвае маміна аднакурсніца, у яе двое дзяцей, мы з мамай ведаем, як яны вучыліся, і думалі, што яны вучылішчы толькі і закончаць, а тут аказалася... Сын «іняз» заканчвае! Я, як дазналася пра гэта, вырашыла аднойчы пад'ехаць да яго з хатнім заданнем па англійскай мове, і як жа я здзівілася, што ён па ведах на маім ўзроўні! А як я ведаю англійскую, наша англічанка за галаву хапаецца... Дужа нервавалася мама гэтага вундэркінда, прасіла, каб я не турбавала больш ейнага сына... А маме патлумачыла па вялікім сакрэце, па-сяброўску, што яна выдае кнігі загадчыка кафедры гэтага ўніверсітэта...

Дзіўная цішыня павісла над намі. Ніхто ўжо не хацеў болей працягваць якую-небудзь гаворку. Цяжкая безвыходнасць, як нечаканы метэарыт, накрыла, здавалася, усіх нас. Толькі Віка, цяжка ўздыхнуўшы, разважліва падсумавала ўсё пачутае:

— Толку з таго, Таццяна Фёдараўна, што вы мазгі сваёй фізікай сушылі, што з яе маеце! Добра, як мы скінемся на падарунак добры вам да свята, ды ў рэпетытары вас пазаве які вучань багаты! Вы ж тады на сёмым небе ад радасці! І адзнакі тады таму вучню малююцца, і кантрольныя чамусьці ён піша ўжо на васьмёркі-дзявяткі, хоць жа дуб-дубам. Вы думаеце, мы не разумеем, чаму ў кагосьці такія поспехі? Шчэ як разумеем! Вунь суседка па парце Тоня ўбачыла, як Сяргей голыя месцы для адказаў у сшытку пакідае, а тады бяжыць да вас, бярэ сшытак лепшага вучня і спісвае ў вашым жа кабінеце, пры вас! І вы яму дапамагаеце, калі што няправільна ў таго лепшага вучня. Во дзе свет-перасвет, Таццяна Фёдараўна! Мы вучымся жыццю ў вас! — раптам выдыхнула ў твар настаўніцы.

У класе стаяла мёртвая цішыня. Ніхто ніколі з нас не асмеліўся б вось так, перад заканчэннем школы, перад выпускнымі экзаменамі! Мы ж — адзінаццаты. І тут ладзіць ды дагаджаць трэба ўсім настаўнікам, не дай Бог з якім заесціся. Труба будзе! Хто сёння на такое адважыцца: выказаць у вочы настаўніку праўду? І Таццяна Фёдараўна, наша строгая Таццяна Фёдараўна, жах для ўсіх вучняў, раптам атрымала такога дубчыка! Пры ўсіх! І ад каго? Ад Вікі, у якой двойкі-тройкі і калы па фізіцы!

Усе чакалі развязкі. Цішыня звінела ў вушах. У нас ніколі не было такой цішыні. Звычайна шум, гам, няможна нават сканцэнтравацца, каб улавіць, пра што кажа настаўніца. Асаблівая пакута на сачыненнях. То з аднаго, то з другога боку нясецца:

— Саша, га, Саша! Ты што, аглухла, Саша?! — калі я не адказваю, нервуецца нехта ўголас.

І тады я ўзрываюся.

— А пайшлі вы! Я што, геній? Мне ж таксама трэба падумаць, каб напісаць! Што я ў такім шуме магу!

На фізіцы, праўда, да такога не даходзіла. Гэта быў адзіны прадмет, якога баяліся... Гэта была адзіная незалежная настаўніца, і вось жа на табе! Як жа пры ёй так пасмела выказацца Віка! Во дурніца! Во бухнула!

Нехта кашлянуў. Таццяна Фёдараўна моўчкі падышла да акна, адвярнулася ад класа. І раптам плечы яе сутаргава здрыгануліся. Таццяна Фёдараўна плакала! Усе маўчалі. Кожны з нас, мусіць, думаў, што рабіць, як выйсці з гэтага становішча. Мы чакалі ўсяго, але не гэтага! Слёзы — ад Таццяны Фёдараўны?! Былі б зразумелымі тут гром ды маланкі на адрас Вікі, выгнанне яе з класа з пагрозай, каб больш на ўрок без маці не з'яўлялася. Мы чакалі гневу, абурэння, а тут... У гэты момант я адчула такі боль ды сорам у душы, што хацелася, як і настаўніцы, заплакаць. І ў мяне пачалі макрэць вочы. Падысці б да Таццяны Фёдараўны, штосьці сказаць... Але што? І як паставіцца клас да гэтага? Нядобра ўсё, вой як нядобра! І хто б мог падумаць, што так атрымаецца! Таццяна Фёдараўна была заўсёды строгая, суровая з намі... Рэдка калі ўсмешка прабягала па яе твары. Ды і якія там будуць усмешкі, калі гэткія формулы, задачы перад табой! Я заўсёды блыталася ў фізічных «правадах», я гублялася перад імі, трапляючы ў сетку незразумелых мне токаў, праваднікоў, паўправаднікоў. Я павісала на іх, як павісаюць толькі забітыя маланкай птушкі...

Таццяна Фёдараўна, строгая і суровая, чаму вы плачаце? Няўжо так моцна адгукнулася ў вашым сэрцы тая праўда, якую выдала Віка?! Няўжо так параніла вас гэта жахлівая праўда жыцця?

Нібы пачула мой унутраны голас настаўніца, рэзка павярнулася да класа, выцерла ўзмакрэлы ад слёз твар. Уся яна была цяпер такой абмяклай, прыціхлай, згорбленай. Куды падзеўся яе прамы стан, строгі выгляд! Перад намі стаяла звычайная, прыбітая горам жанчына. Вочы яе былі сумныя-сумныя. Яна глядзела на нас і быццам паўз нас. Некуды ўдалячынь, праз сцяну... І пачулі мы ўрэшце тое, ад чаго, колькі б ні жыць, будзе цямнець перад вачыма, будзе дранцвець цела:

— Даруйце мне, дарагія мае вучні. Я сапраўды зрабіла непрыгожы крок... Я нанялася ў рэпетытары да вашага аднакласніка за грошы. Упершыню ў жыцці я схібіла... Упершыню я двойчы завысіла адзнакі, дапамагла зрабіць яму кантрольныя... За грошы, дзеці, за грошы. Усе бяруць — і я ўслед за ўсімі... Я не змагу, мусіць, болей прыходзіць да вас, вучыць вас. Пэўна ж, права не маю.

Таццяна Фёдараўна зноў заплакала. Дрыготкімі пальцамі нервова ўзялася за голаў, страпянулася, як пакалечаная птушка:

— Але ведайце, мае дарагія, чаму я пайшла на такі крок. У гематалагічным цэнтры памірае мая дачка, таксама, як і вы, выпускніца-адзінаццацікласніца, выдатніца-ліцэістка... Рак крыві... Ёй патрэбны дужа дарагія лекі...

Тут яна ўсхліпнула і рэзка змоўкла. Схапіўшыся за сэрца, захісталася, але, мусіць, сабраўшы ўсе сілы, якія толькі былі ў яе целе, моўчкі выйшла з класа.

А мы, замест таго, каб кінуцца ўслед за вялікім матчыным болем, нібы прыраслі да сваіх партаў і ўпершыню, як ніколі за ўсе адзінаццаць гадоў навучання ў гэтай школе, ціха сядзелі, звесіўшы галовы. Віка, праз якую і пачаўся гэты сыр-бор, размазвала па сваім размаляваным, як у лялькі, твары слёзы. Яны, здавалася, сачыліся ў яе і з пунсовых вуснаў, і са шчок, і з вачэй. Слёзы, як рэкі, цяклі, мне здавалася, адусюль. Іх, як агонь, немагчыма было супыніць ці хаця б сцішыць адразу. І кожны з нас (кожны!) у гэты момант трымаў свой самы галоўны ды суровы экзамен. І на што, і перад кім — гэта было вядома кожнаму з нас паасобку. Вучням самай строгай настаўніцы Таццяны Фёдараўны...

SEX–БАЛЯСЫ

ШЧАСЛІВЫХ ДЗЁН, ШЧАСЛІВЫХ НАЧЭЙ!

— А ты ведаеш, якая незвычайная калекцыя ёсць у мяне? Я збіраю шчаслівыя дні. І ў мяне іх ужо шэсць!
Я здзіўлена азірнуўся на гэты дзіцячы голас, выпадкова пачуты на ганку крамы. Хлопчык размаўляў з маладой жанчынай, хутчэй нават дзяўчынай. Маці і сын? Ці было яму шэсць гадоў і гэтыя дні ў яго асабістай скарбонцы шчасця з'яўляліся днямі нараджэння, меркаваць не бяруся. Мне здалося, што дзіцяці было крыху менш гадоў. Значыць, у калекцыі шчаслівых дзён, напэўна, былі не толькі дні нараджэння, але і іншыя. Цікава, якія? Вяртанне таты з камандзіроўкі, прыезд бабулі і дзядулі? Хлопчык вымавіў усё так шчыра, што мне не хочацца думаць, што ён меў на ўвазе нешта матэрыяльнае. Гэта яшчэ той узрост, калі самым важным з'яўляецца іншае... Калі гэта так, то, як той казаў, вуснамі дзіцяці была агучана ісціна. Толькі ўдумайцеся, як гэта здорава — калекцыянаваць шчаслівыя дні свайго жыцця!..

Напрыклад, як можна забыць той дзень, калі ты ўпершыню зразумеў, што табе падабаецца дзяўчына-аднакласніца ці, скажам, суседка? Ці калі, пераадолеўшы сябе (толькі табе аднаму вядома, чаго гэта каштавала), запрасіў яе ў кіно ці на танцы... Ці калі ты ўпершыню пацалаваўся... Ці калі было, як калісьці спявала Наташка Каралёва, «первое «хочу», первое «нельзя»... Не, у той момант гэта, бясспрэчна, падаецца найвялікшай трагедыяй, толькі з цягам часу ты разумееш, што чаканне ў першы раз «таго самага» — гэта таксама шчаслівы момант жыцця, які больш нельга паўтарыць... Або калі ты зразумеў, што нарэшце сустрэў яе, тую адзіную, з якой гатовы ісці побач далей па жыцці?..

У кожнага з нас свае амбіцыі, свае памкненні, уласныя ўяўленні пра дабрабыт. Усе мы розныя, але кожны з нас аднолькава хоча быць шчаслівым. Іншая справа, што чалавек укладае ў гэтае паняцце, калі сталее. Памятаеце, як у анекдоце: «Спытай у чалавека, што такое шчасце, і ты даведаешся, чаго яму не хапае»? Дык што нам патрэбна для шчасця? З жанчынамі ўсё проста. Ім для шчасця патрэбна толькі адна рэч. Але кожны дзень — новая (ну, прабачце, не стрымаўся...). Першае, што прыходзіць у галаву, вядома ж, грошы. «Зразумела, шчасце не залежыць ад колькасці грошай. Але лепш плакаць у лімузіне, чым у аўтобусе». Хто б спрачаўся: з імі ўсё ж значна прасцей! Кватэра, аўтамабіль, падарожжы па свеце — гэта і ёсць матэрыяльнае ўвасабленне тых самых грашовых знакаў, якія даюць нам свабоду выбару і дзеянняў. Гэта цалкам нармальна, калі чалавек разумее, што матэрыяльныя сродкі — плата за яго працу, за яго намаганні.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

...Не я заўважыў, жонка — аматарка меладрам — падказала. Прыгледзеўся, і сапраўды так. Гэта я пра тое, што практычна кожная сучасная расійская кінастужка цяпер заканчваецца хэпі-эндам, абавязковым атрыбутам якога з'яўляюцца грошы і багацце, якое само прыходзіць у рукі гераіні. Жыла-была Папялушка, яна сустрэла хлопца, не ўсё ў іх адразу наладзілася, але ў выніку яны злучылі свае лёсы. А потым раптам высветлілася, што ён — алігарх. Ну, вось так неяк, выпадкова... Гэта кароткі пераказ сцэнарыяў большасці фільмаў такога кшталту. Вы заўважылі, што ў кіно сёння не вельмі часта можна пабачыць інтэр'ер звычайнай кватэры? Нават прадстаўнікі «сціплых» прафесій пражываюць, як правіла, у апартаментах, пра якія большасць з нас могуць толькі марыць. І, наглядзеўшыся такога, дзяўчаты пры поўнай падтрымцы родных пачынаюць шукаць абавязкова заможнага жаніха — гэткага прынца на белым кані. Калі не з пасагам у паўцарства, дык прынамсі з палацам-катэджам. Пэўна ж, часы, калі «рай быў з мілым і ў шалашы», мабыць, прайшлі. Ці варта наконт гэтага засмучацца? Не мне меркаваць...

У кожнага з нас свае амбіцыі, свае памкненні, уласныя ўяўленні пра дабрабыт. Усе мы розныя, але кожны з нас аднолькава хоча быць шчаслівым. Іншая справа, што чалавек укладае ў гэтае паняцце, калі сталее.

...На здымнай кватэры мы з жонкай пражылі дзевяць гадоў. Бывала, што на яе аплату ішла палова ўсяго зароблена. Калі мы туды засяліліся, інтэр'ерам аднапакаёвая сціплая кватэра была падобная на жыллё студэнткі Ніны з навелы пра Шурыка: у стылі 1960—1970-х. Але я з гонарам запрашаў гасцей у нашы «харомы». Мы былі шчаслівыя ад таго, што можам здымаць жыллё самі і за ўвесь час не ўзялі ў бацькоў ніводнай капейкі! Я дагэтуль памятаю першую нашу сумесную сямейную вячэру. Вельмі сціплую, але, здаецца, такой смачнай смажанай каўбасы я больш ніколі ў жыцці не еў!..

Толькі поўны, прабачце, дурань будзе сцвярджаць, што жыццё — гэта выключна пялёсткі ружаў. Бывае па-рознаму... Часам як у анекдоце: «Я падарыў жонцы футра, і яна ўжо два тыдні маўчыць». — «Што здарылася?» — «Такой была ўмова». І калі ў выніку не атрымаецца знайсці агульнай мовы, можна атрымаць віншаванне прыкладна такога зместу: «Хачу выказаць вялікую ўдзячнасць свайму колішняму за тыя шалёныя, незабыўныя, напоўненыя радасцю і шчасцем дні, якія мне пашчасціла пражыць... адразу пасля нашага расставання». Каб гэтага не было, мірыцеся. Як у народзе кажуць пра такія выпадкі: ночка цёмная памірыць.

Таму напрыканцы, скарыстаўшыся тым, што гэта першая наша размова ў новым годзе, хацеў бы пажадаць усім чытачам як мага больш шчаслівых дзён у вашыя асабістыя калекцыі. А маючы на ўвазе накіраванасць нашай рубрыкі — і нясумных вам ночак!

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«НЕПУНКТУАЛЬНЫ ІНТЭЛІГЕНТ БЕЗ СТЭРЭАТЫПАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Як ацэньваеш сённяшняе сваё дасягненні?

— Поспехам сваё сённяшняе становішча я дакладна не стаў бы называць. Вось калі буду збіраць канцэртную залу «Алімпійскую» ці мае песні будуць ва ўсіх на слыху, мяне пачнуць усюды пазнаваць, то, магчыма, можна будзе гаварыць пра поспех.

— Чаго ты не прымаеш у жыцці?

— Я не магу цярпець крывадушнасці, з якой часта даводзіцца сустракацца. Люблю адкрытых і простых людзей, у стасунках з якімі разумееш, што яны не зменяць свайго стаўлення да цябе ні пры якіх умовах.

— Калі пачалося тваё захапленне музыкай?

— Мабыць, у 12 гадоў, калі я таемна ад бацькоў пракалоў вуха, чытаў рэп, насіў шырокія штаны і тусаваўся на вуліцы. Тата ў мяне ваенны, таму ён быў супраць маёй кампаніі, і з часам давялося паставіць крыж на музыцы. Нават аднакласнікі не раздзялялі майго захаплення графіці і брэйк-дансам. А потым паступіў ва ўніверсітэт на факультэт міжнародных эканамічных адносін. Там таксама з'явілася свая сяброўская кампанія, дзе мы займаліся стварэннем музыкі, ладзілі розныя вечарынкі, шукалі сабе прыгоды. Яшчэ я падпрацоўваў у клубах як прамоўтар. Праз нейкі час перавёўся на завочнае навучанне і засяродзіўся на клубнай дзейнасці.

— Твая першая песня была прысвечана дзяўчыне, а як цяпер нараджаюцца новыя кампазіцыі?

— Раней песні з'яўляліся з-за жадання іх пісаць, а сёння я проста раблю сваю справу. Такога, каб сядзець і чакаць натхнення, ужо няма. Таксама адсутнічаюць любыя алгарытмы і крытэрыі таго, ці будзе музычны матэрыял мець поспех у публікі.

— Дзіма, ты ўдзельнічаў ва ўкраінскай «Фабрыцы зорак», выступаў на «Новай хвалі». А якія перспектывы бачыш для сябе ў Беларусі?

— Сёння я заўсёды еду туды, дзе чакаюць і гатовы добра плаціць за нашы выступленні. Адразу пасля «Фабрыкі зорак» я год жыў у Маскве і добра разумею, дзе і які ўзровень. На той час, калі мы пісалі альбом, знаходзіўся ў Мінску. Я мужчына, якому трэба зарабляць. А на беларускім рынку мне ніхто не будзе плаціць тых грошай, якія прапаноўваюць у Маскве.

— Складана было заявіць пра сябе ў расійскай сталіцы?

— Без прадзюсара ўсюды складана. Там усё вырашаюць грошы. А наогул трэба, каб была каманда, зацікаўленая агульнай справай.

— У цябе ёсць такая каманда?

— У мяне ёсць прадстаўнікі ў Кіеве, Мінску, Маскве. Са мной працуюць музыканты. Майк Стоцік — наш гітарыст, з ім мы пісалі ўвесь матэрыял для новага альбома. На бас-гітары іграе ў нас Воўчык Развадоф. Жэня Рапацэвіч — на барабанах. Ён прыйшоў у каманду, калі мы ўжо выступалі з дыджэем. Адносіны ў нас вельмі добрыя.

— Вы сябруеце паміж сабой?

— Калі гаварыць пра сяброў, на мой погляд, яны бываюць розныя: па працы, па інтарэсах, па адпачынку. А ў нас усё спалучаецца ў адным.

Нас аб'ядноўвае любоў да стварэння музыкі. У дачыненні да сяброў у мяне дзейнічае прынцып «давярай, але правярай», і я адкрываюся толькі тым людзям, якія ўжо прайшлі са мной пэўныя жыццёвыя сітуацыі. Пра чалавека ж многае гавораць яго ўчынкі, нават самыя, здавалася б, нязначныя. Цяпер я стаў вельмі асцярожным у выбары сяброў.

— Што дае табе сцэна?

— Да сваіх выступленняў я стаўлюся як да працы. Безумоўна, мог бы займацца і нечым іншым, але на сёння мяне задавальняе тое, што маю. Мне не хочацца папулярнасці для сябе, яна патрэбна майму музычнаму матэрыялу. Тое, чым я займаюся, дае мне і магчымасць духоўнага росту. Напрыклад, мы з кампаніяй аднадумцаў падтрымліваем дзіцячыя дамы. І я разумею, што нечым карысны для іншых людзей. Мае песні няхай і не на працяглы час, але дораць добры настрой, выклікаюць усмешку. У такія моманты ўсведамляеш, што, калі ў цябе ўсё добра, вельмі важна не забываць пра іншых.

Алена ДРАПКО.

Стракаты свет

НА МЕСЯЦЫ І ВЕНЕРЫ ГАРБАТКІ НЕ ВЫП'ЕШ?

Тытан, спадарожнік Сатурна, можа быць самым зручным для чаяпіцця месцам у Сонечнай сістэме за межамі Зямлі. Да такой высновы прыйшлі маладыя брытанскія фізікі, якія апублікавалі вынікі сваёй работы ў часопісе Physics Special Topics.

Група навукоўцаў ацэньвала, наколькі для тыпова брытанскага баўлення часу падыходзяць Венера, Марс, а таксама спадарожнікі Сатурна, Нептуна і Юпітэра. Даследчыкі ацэньвалі не толькі тэмпературу кіпення вады, але і наступствы выпітага на кожным касмічным аб'екце кубка гарбаты для цела чалавека. Месяц фізікі адразу адверглі, паколькі вада там закіпае пры мінус 162 градусах па Цэльсію, што крышачку цяплей за вадкі азот і «можа выклікаць сур'ёзныя гастраэнтэралагічныя праблемы».

На Марсе вада закіпіць пры плюс 4 градусах па Цэльсію, што, як адзначаюць аўтары, «блізка да ідэальнай тэмпературы падачы марожанага»: выпіць такі напой будзе ўжо хоць і бяспечна, але наўрад ці прыемна. На паверхні Венеры вада закіпіць пры непрактычных 273 градусах па Цэльсію, аднак на вышыні прыкладна 50 кіламетраў умовы для чаяпіцця адпавядаюць зямным, таму брытанцы раяць перад высадкай пабудаваць платформу такой вышыні, каб «даследчыкі маглі, калі што, папіць гарбаты». Для Тытана значэнне кіпення вады складае плюс 16 градусаў, і такі чай брытанцы палічылі «нясмачным, але прыдатным для ўжывання».

Трэба дадаць, што маладых навукоўцаў, якія публікуюцца ў часопісе Physics Special Topics, цікавіць незвычайнае кола тэм. Напрыклад, летась яны высвятлялі, ці можна... ацяпляць памяшканне цяплом, якое выпрацоўваецца членамі брытанскага парламента падчас напружаных дыскусій.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 22.817.
Нумар падпісаны ў 19.30 15.01.2013 г.

МЕСЯЦОВЫ ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 2014 ГОД

Расліна	студзень	люты	сакавік	красавік	май	чэрвень	ліпень	жнівень	верасень	кастрычнік	лістапад	снежань
НАЙЛЕПШЫЯ ДНІ ДЛЯ ПАСАДКІ І СЯЎБЫ												
Вельмі спрыяльныя дні для большасці раслін з падземнай ядомай часткай (караняплоды)	17, 24-27	21-23, 27	20-23, 26-27	16-17, 22-23, 26-27	15-16, 23-25	16-17, 19-21, 24-25	13-14, 17-18, 21-23	13-15, 17-19, 23	10-11, 14-16, 19-20	11-13, 16-17	8-9, 13	7, 10-11, 18-20
Вельмі спрыяльныя дні для большасці раслін з надземнай ядомай часткай	3-4, 6-8, 11-13	3-4, 7-9, 13	3-4, 7-9, 12-13	3-5, 8-9	1-2, 6, 30	2-3, 10-12, 29-30	7-10	4-6, 31	1-3, 6-7, 27-30	3-4, 7, 26-27, 31	1, 3-5, 27-28, 30	1-2, 5, 24-25, 28-29
Кветкі цыбульныя	24-26, 29	23, 26-27	21-23, 25-27	16-19, 20-24, 26-27	15-20, 24-25	15-17, 21, 24-25	13-14, 18, 22-23	13-14, 18, 23	11, 15-16, 20	11-17, 21-22	8-13, 17-20	7, 11, 19
Кветкі з насення	3-4, 7-8, 11-14	3-4, 7-9, 13	3-4, 7-9, 12-13	3-9, 13-14	1-6, 10-13, 30-31	1-3, 7-12, 29-30	6-10, 31	4-6, 28-31	1-4, 6, 28-29	3-4, 27, 31	4-5, 27-28, 30	2, 5, 24-25, 29
Кабачкі, патысоны, гарбуз	3, 6-8, 12	3-4, 8-9, 11-13	3-4, 7-13	3-9, 13-14	1-6, 10-13, 30-31	1-3, 8-11, 30	8-9, 31	5-6, 30-31	2-3, 6-7, 27-30	4, 26-27	1, 4-5, 28, 30	1-2, 25
Бручка, рэпа	-	-	20-22, 26-27	16-23, 27	15-19, 23-25	16, 19-20, 24	14, 18, 22-23	14-15, 18-19, 23	11, 15-16, 20	16-17	-	-
Гарох, фасоля, бабы	-	3, 7-8, 12-13	3-4, 7-8, 11-13	3-8, 13	1-5, 10-12, 30	1-2, 7-8, 10-11, 29	7-10	4-6	1-3, 6-7, 27-29	-	-	-
Суніцы садовыя (клубніцы), рэвень	11-13	8-9, 13	3-4, 7-12	4-8, 14	1-4, 6, 12-13, 30-31	3, 12, 29-30	7-9	5-6, 28-31	2-3, 7, 27	3-4, 26-28	27-28	-
Капуста (у т.л. квяцістая), спаржа	6-8, 12	7-9, 13	3-4, 7-13	3-9, 13-14	1-6, 11-13, 30	2-3, 10, 29	8-10	5-6	1-2, 28-29	-	-	-
Бульба, тапінамбур	12-13	12-13	3, 10-12	8-9, 14	1-6, 10-13, 30-31	1-3, 8-12, 30	7-9	-	-	-	-	-
Цыбуля на пяро	11-13	3-4, 7-9, 13	3-4, 7-9, 12-13	3-6, 8-9, 13-14	1-2, 6, 30	2-3, 11, 30	8-9	5-6, 31	2-3, 7, 29-30	3-4, 26-27	4-5, 27-28, 30	1-2, 5, 24-25
Цыбуля на рэпку	24-26	23, 27	20-23, 26-27	16-23, 26-27	15-20, 23-25	16, 19-20	13, 17, 21-22	-	-	-	-	-
Морква, пастарнак (на корань)	25-28	27	20-22, 27	16-19, 23, 26-27	15-16, 23-25	16-17	-	-	-	-	-	-
Агуркі, кавун, дыня, кукуруза	11-13	7-9	3-4, 7-13	3-6, 8-9, 13-14	1-6, 11-13, 30	2-3, 10-11	7-10	4-6, 31	2-3, 6-7, 27-28	7, 26-27	3-5, 30	5, 28-29
Перац салодкі, баклажаны	3-4, 6-8, 11-15	3-4, 7-13	3-4, 7-13	3-5, 8-9	1-2, 6, 30	2-3, 10-12	7-10, 31	5-6, 31	2-3, 6-7, 27-29	3-4, 26-27	3-5, 27-28, 30	5, 24-25, 28-29
Перац пякучы (любіць пасеў у знаку Стральца, незалежна ад фазы месяца)	11-13, 28-29	7-9, 24-26	3-4, 7-9, 24-25	3-5, 8-9, 20-21	1-2, 6, 17-18, 30	2-3, 10-12, 14-15	7-11, 31	7-9, 31	2-5, 27-29	1-4, 27-31	3-5, 23-28	5, 24-25, 28-29
Пятрушка на зеляніва	-	-	7-8, 12-13	3-8, 14	1-2, 5-6, 12-13, 30-31	1-3, 7-9, 10-12, 29	-	4-6, 30	2-3, 6-7, 29-30	3-4, 7, 26-27, 31	1, 3-5, 30	24-25
Пятрушка на корань	25-27	21-23, 27	17-23, 26-27	16-23, 26-27	15-18, 23-25	15-17, 24-25	-	13-15, 17-19, 23	-	-	8-9, 13	-
Сланечнік	-	3-4, 11-12	12-13	3-5, 8-9, 13-14	1-2, 6, 11-13, 30	2-3, 10-12, 29	-	-	-	-	-	-
Радыска, рэдзька, дайкон	24-26	22-23, 26-27	20-23, 26-27	16-22, 26-27	15-20, 23-25	16-17, 19-21, 24-25	17-18, 21-24	13-15, 17-21, 23	10-11, 14-16, 19-20	11-13, 16-17	-	-
Салата, шпінат, мангольд	6-7	7-9	3-4, 7-9, 12-13	3-9, 14	1-4, 6, 10-12, 30-31	1-3, 7-12, 29-30	6-11, 31	2-6, 8-9, 28-31	1-3, 7, 29-30	3-4, 7, 31	-	-
Буракі	17, 24-27	21-22, 27	21-23, 27	16-22, 26-27	15-19, 23-25	16-17	17-18, 23	-	-	-	-	-
Сельдэрэй (каранёвы)	17, 24-27	21-23, 27	18-24, 26-27	16-23, 26-27	15-19, 23-25	15-17, 19-20, 25	13-14, 17-18, 21-25	-	-	-	-	-
Памідоры	3-4, 6-8, 11-15	3-4, 7-13	3-4, 7-13	3-9, 13-14	1-2, 3-6, 10-13, 30-31	1-3, 7-12, 29-30	7-10, 31	4-6, 31	1-3, 6-7, 27-30	3-4, 7, 26-28, 31	1, 3-5, 27-28, 30	1-2, 5, 24-25, 28-29
Кроп, фенхель, кінза, кмен, гарчыца	3-4, 6-8, 11-13	3-4, 7-9, 13	3-4, 7-10, 12-13	3-9, 13-14	1-6, 10-12, 30-31	1-3, 8-12, 29-30	7-10	4-6, 31	1-3, 6-7, 27-30	3-4, 7, 26, 31	4-5, 30	1-2, 28-29
Хрэн	25-27	21-23	20-23	17-19, 21-23, 27	15-19, 24-25	17, 20-21, 25	14, 18, 22-23	13-15, 17-19, 23	10-11, 15-16, 19-20	11-14, 17	8-9, 13	7, 10-11
Часнок	17, 24-26	21-22	19-22, 25-27	16-19, 21-23, 26-27	15, 23-24	16, 19-21	13, 17, 21-22	13-14, 17-18, 22-23	10-11, 14-17, 19-20	11-17, 21-22	8-13, 17-19	7-10, 15-16, 18-20
ЗАБАРОНЕННЫЯ ДНІ ДЛЯ ПАСАДКІ, СЯЎБЫ І ПЕРАСАДЖВАННЯ												
	1-2, 30-31	-	1-2, 29-31	28-30	27-29	26-28	26-28	24-26	23-25	23-25	21-23	21-23

Прочырк азначае, што саджаць і перасаджваць можна ў любы дзень спрыяльнай фазы месяца, выключаючы забароненыя дні.

ПОЎНІ Ў 2014 ГОДЗЕ:

студзень	люты	сакавік	красавік	май	чэрвень	ліпень	жнівень	верасень	кастрычнік	лістапад	снежань
16	15	16	15	14	13	12	10	9	8	7	6

У поўню расліны атрымліваюць найбольшую сілу. Пасеў і пасадка не рэкамендуецца, але калі поўня супадае са спрыяльным днём (месяц ва ўрадлівым знака задыяку), то можна. УВАГА! У 2014 годзе вельмі мала цалкам спрыяльных дзён для пасеву раслін з падземным ураджаем. Не грэбуйце днямі поўні і днямі, калі месяц убывае, але ў спрыяльным (урадлівым знаку задыяку).

КАЛЯНДАР САДОВА-АГАРОДНЫХ РАБОТ НА 2014 ГОД

Віды работ	студзень	люты	сакавік	красавік	май	чэрвень	ліпень	жнівень	верасень	кастрычнік	лістапад	снежань
Унясенне арганічных угнаенняў	2, 12—16	1, 18—20, 22—224, 26—28	3—5, 21—23, 26—28, 31	1-2, 5—7, 10—14, 18—20, 22—24, 27—29	2, 2—-22, 24—27, 29—31	1, 3, 10—12, 16—18, 21—23, 26—30	1, 7—9, 18—20, 23—25	19—22, 24—26	6—10, 16—18, 21—23, 25—28	13—15, 18—20, 22—24	—	—
Унясенне мінеральных угнаенняў	—	9—12, 14—16, 18—20	8—11, 13—15, 17-18	1-2, 5—7, 10—14, 18—20, 22—24, 27—29	7—9	1, 3, 10—12, 16—18, 21—23, 26—30	1, 7—9, 18—20, 23—25	1—3, 10—12, 19—23, 24—26, 28—30	6—10, 16—18, 21—23, 25—28	3—8, 24—26	—	—
Закладка кампосту	—	—	1—3, 20—21, 26—31	2-3, 20—27	1-2, 17—24, 27—29	1-2, 17—21, 23—26, 28—30	16—18, 20—23, 25—28	14—28	13—20, 23—27	13—18, 20—26	11—14, 16—23	—
Узворванне, культывацыя, абганянне, рыхленне	—	1-2, 19—22, 26—28	3, 8—11, 13—15, 17—23, 31	2—3, 17—24, 27—29	1-2, 17—24, 27—29	1-2, 18—21, 23—26,28—30	16—18, 20—23,25—28	17—19, 22—24, 26—28	13—15, 18—20, 23—27	13—25	11—14, 16—21, 23—25	14—18, 20—24
Абрэзка галін і парасткаў	2—3,31	1, 21—28	1-2, 22—31	1,21—30	20—30	19—28	18—28	16—26	15—25	15—24	13—23	13—22
Апырсканне, знішчэнне шкоднікаў	—	20-22, 24—26	1—3, 21—26	2, 18—22, 24—27, 29—30	1-2, 22—24, 27—29	3—5, 7—12, 24—29	20-23,25-28	17—19,22—24,26—28	13—15,18-20,23—29	13—18	11—14, 16—19	20—24
Інтэнсіўны паліў	2,12—16	20—22	3—6, 8—11, 13—15, 21—23, 31	5—7, 10—12, 18—20, 22—24, 27—29	2—4, 7—9, 15—17, 24—27,29—31	3,10—12, 16—18, 21—23, 26—30	16—20, 23—25, 28—30	1—3, 10—12, 19—22, 24—26	1, 6—10, 28—29	13—16	14—16, 23—25	20—24
Прышчэпка	2—3,31	20—22	8—11,13—15, 21—23	5—7, 10—12, 18—20	—	16—18	2—3, 9—11, 13-14	—	—	—	—	—
Пасадка, перасадка, пікіроўка	9—11, 19—25	9—12, 14—16	1—3, 8—11, 13—15, 17—23, 26—29	5—7, 10—12, 16—17, 22—24	акрамя маладзіка і поўні	3—5, 10—12, 30	18—20, 24—25, 28—30	10—12, 24—26	1—4, 6—8, 15—18, 20—23, 26, 28—30	акрамя маладзіка і поўні	—	—
Праполка, прарэджванне ўсходаў	9—11	2, 18—20, 22—24	20—23	2-3, 18—27, 29	2—4, 7—9, 24—27, 29—31	1—2, 18—21, 23—26, 28—30	16—18, 20—23, 25—28	17—19, 22—24, 26—28	13—15, 18—20, 23—27	13—18	—	—
Нарыхтоўка насення	—	4—7, 9—12, 14—16, 22—24	8—11, 21—23	10—12, 16—17	7—9, 15—16	3—5, 10—14	16—23	3—5, 7—10, 12—14, 30-31	4—6, 8—10, 13—15, 18—20	15—18, 20—26	11—14, 16—23	6—9, 18—20 ,26—29

Розныя фазы Месяца аказваюць неаднолькавае ўздзеянне на рост і развіццё раслін. Даўно заўважана, што дні маладзікаў і поўні не падыходзяць для пасадачных і перасадачных работ. На поўню вялікая частка сокаў знаходзіцца ў верхняй частцы расліны, у сцябле і пладах, а на маладзік наадварот, у яго падземнай частцы — клубнях і каранях. Насенне, якое трапляе ў зямлю пры Месяцы, які расце, праграмуецца на больш актыўны рост угару і развіццё над зямлёй, а тое, якое было пасаджана пры ўбываючым Месяцы, мае тэндэнцыю развіцця пад зямлёй. Таму расліны, плады якіх знаходзяцца над зямлёй, трэба сеяць і саджаць пры Месяцы, які расце. А ўсе караняплоды — пры ўбываючым Месяцы.

У першай чвэрці пераважае энергія вады, таму, калі ў гэты час абразаць садова-агародныя культуры, раны будуць доўга і дрэнна гаіцца.

У апошняй чвэрці актывізуецца энергія агню, насенне і плады маюць найвышэйшую энерганасычанасць. Гэты перыяд лепш за ўсё падыходзіць для збору насення, якое ў далейшым дасць дружныя ўсходы і багаты ўраджай.

Акрамя таго, пры работах у садзе і агародзе важна ўлічваць, у якім знаку задыяка знаходзіцца Месяц, паколькі ўсе знакі падзяляюцца на ўрадлівыя, знакі сярэдняй урадлівасці і неўрадлівыя.

Урадлівыя знакі задыяка: Рак, Скарпіён, Рыбы.

Знакі сярэдняй урадлівасці: Цялец, Шалі, Стралец, Казярог.

Неўрадлівыя знакі задыяка: Авен, Блізняты, Дзева, Леў, Вадалей.

Назіранні паказваюць, што ўраджай будзе вышэйшы, калі пры пасеве ўлічваць фазу Месяца і яе знаходжанне ва ўрадлівым знаку задыяка.

Тыя, хто хоча разлічыць сабе індывідуальны графік садова-агародных работ у адпаведнасці з мясцовымі ўмовамі і сваімі мэтамі, павінны ўлічваць праходжанне Месяцам знакаў задыяка.

Калі знак, у якім знаходзіцца Месяц, і яго фаза супярэчаць адно аднаму (напрыклад, Месяц у Шалях, што добра для бульбы, але ён расце, а трэба, каб убываў: бульба ж расце пад зямлёй), арыентуйцеся на знак задыяка і грэбуйце фазай Месяца, але па-разумнаму: паспрабуйце пасадзіць як мага бліжэй да спрыяльнай фазы, гэта значыць у апошні дзень знаходжання Месяца ў патрэбным знаку.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«19-этажный жилой дом со встроенными административными помещениями в квартале ул. Аэродромная – ул. Левкова – ул. Володько»

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Белпромоптторг», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 31 августа 2000 г. № 970 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100587654.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 2, комната 6.

Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Белпромоптторг» строительство не осуществляло.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – исполнение условий договора № 131-Д от 20 мая 2013 года, заключенного с Минским городским исполнительным комитетом на реализацию права проектирования и строительства 19-этажного жилого дома со встроенными административными помещениями в квартале ул. Аэродромная – ул. Левкова – ул. Володько.

